ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 чэрвеня 1917 г.

14 ВЕРАСНЯ 2017 г. ЧАЦВЕР №177 (28541)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Юнкары, на старт!**



**Чым сталкераў вабяць зоны?**



**Дзяўчына… хакейны варатар**

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Жанна КУЛАКОВА, фінансавы аналітык:**

*«Зніжэнне стаўкі рэфінансавання цалкам апраўдана. Інфляцыя запавольваецца рэкорднымі для нашай краіны тэмпамі. Па выніках жніўня другі месяц запар была зафіксавана дэфляцыя — такога яшчэ не здаралася за ўсю гісторыю незалежнай Беларусі. Зараз інфляцыя ў гадавым выражэнні складае 5,3%, і гэта таксама рэкорд. З улікам сённяшній сітуацыі ў стаўкі рэфінансавання застаецца патэнцыял для далейшага зніжэння».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 14.09.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9392 | ▲ |
| Еўра | 2,3219 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0335 | ▼ |
| Укр. грыўня | 0,0743 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

# Вучэнне — ад слова «вучыць»

**Сёння пачынаецца сумеснае стратэгічнае вучэнне ўзброеных сіл Беларусі і Расіі «Захад-2017»**



Фота БЕЛТА.

Расійскі танкіст сяржант Арцём ВІЛКАЎ і беларускі вайсковец яфрэйтар Міхаіл САЎКО.

**Нагадаем, яно носіць выключна абарончы характар і не нясе ніякай пагрозы як для суседніх краін, так і для еўрапейскай супольнасці ў цэлым. Вучэнне, якое рэгулярна праводзіцца або на тэрыторыі Расіі, або ў нашай краіне, заўжды накіравана толькі на тое, каб навучыць абедзве арміі ў выпадку неабходнасці абараніць свае межы.**

Практычныя дзеянні войскаў у асноўным будуць адпрацоўвацца на тэрыторыі Беларусі, а таксама на трох палігонах суседняй дзяржавы. Як падкрэсліў **начальнік дэпартамента міжнароднага ваеннага супрацоўніцтва — памочнік міністра абароны па пытаннях міжнароднага ваеннага супрацоўніцтва генерал-маёр Алег ВОІНАЎ**, пры вызначэнні раёнаў практычных дзеянняў для выключэння напружанасці ў адносінах з Украінай, Польшчай, Літвой і Латвіяй прынцыпова выбраны палігоны, якія знаходзяцца на значнай адлегласці ад дзяржаўнай мяжы.

Усяго ў вучэнні, якое праводзіцца пад кіраўніцтвам начальнікаў генеральных штабоў узброеных сіл — першых намеснікаў міністраў абароны двух дзяржаў, задзейнічана каля 12 700 ваеннаслужачых. Пры гэтым на тэрыторыі Беларусі рэалізоўваць пастаўленыя задачы будзе каля 10 200 чалавек, а таксама 370 адзінак бранятанкавай тэхнікі, да 150 адзінак артылерыі і рэактыўных сістэм залпавага агню, звыш 40 самалётаў і верталётаў — іх колькасць не перавышае ўзровень, падлеглы абавязковаму назіранню за пэўнымі відамі ваеннай дзейнасці, якія ўстаноўлены шматлікімі дагаворамі і пагадненнямі ў галіне кантролю над узбраеннем. На працягу многіх гадоў параметры задзейнічаных у краіне сіл і сродкаў застаюцца практычна нязменнымі.

— Пры вызначэнні задумы вучэння ўлічваліся сучасныя падыходы да прымянення войскаў (сіл) на аснове вопыту сучасных узброеных канфліктаў, — адзначыў Алег Воінаў. — У яго аснову пакладзены варыянт узнікнення крызіснай сітуацыі і нарастання канфлікту, звязанага з узрастаннем актыўнасці дзейнасці незаконных узброеных фарміраванняў міжнародных сепаратысцкіх і тэрарыстычных арганізацый, якія маюць знешнюю падтрымку. Пры гэтым супрацьлеглыя бакі ўмоўна размешчаны ў рэальных межах Беларусі. З аднаго боку — паўночныя, якія ўключаюць у сябе Саюзную дзяржаву Беларусі і Расіі. З іншага — заходнія: кааліцыя зацікаўленых дзяржаў. Па падобным сцэнарыі ў апошні час і распачыналіся ўзброеныя канфлікты. У сваю чаргу, Беларусь імкнецца не дапусціць развязвання ўзброенага канфлікту, дэстабілізацыі абстаноўкі ў рэгіёне, а Расія, у адпаведнасці з дзейнічаючай нарматыўна-прававой базай, аказвае нашай краіне палітычную падтрымку, а таксама фінансавую, ваенна-тэхнічную і ваенную дапамогу.

СТАР. 2

■ Соцыум

# ДАБРЫНЯ СА СМАКАМ КАВЫ

**У Лідзе двое хлопцаў адкрылі пляцоўку, дзе будуць працаваць людзі з інваліднасцю**

**Праект яшчэ толькі пачаў «раскручвацца». Яго ініцыятарам стаў Аляксандр Аўдзевіч, інвалід-калясачнік, які набірае групу для навучання прафесіі барыста.**

Сябры Аляксандра — Дзмітрый і Кірыл — гатовы даць работу ў сваёй кавярні. Яны адкрыліся зусім нядаўна ў цэнтры горада.

За стойкай звычайна працуе адзін з уладальнікаў — Дзіма Верун. Ён прапануе некалькі разнавіднасцяў кавы, у шырокім асартыменце ёсць і гарбата. Яна падаецца ў белым заварачным чайніку. Хутка тут прапануюць яшчэ марожанае і сэндвічы, праўда, і зараз ёсць некалькі відаў піражных.

Пакуль частуюся гарбатай, разглядаю інтэр'ер і наведвальнікаў. Сама сабе вызначаю стыль — авангардны мінімалізм. На белых сценах у рамках вісяць выказванні вядомых людзей. У тым ліку цытата на англійскай мове аднаго з прэзідэнтаў ЗША Джона Кенэдзі, дзе ёсць такія словы: «Я знайшоў, як быць шчаслівым з самім сабой...» На супрацьлеглай сцяне — некалькі выяў рок-музыкантаў, іх цытаты. Аказваецца, уласнікі кавярні таксама музыканты і нават выступаюць са сваёй праграмай у сталічных клубах.



СТАР. 4

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!
ПАДПІШЫСЯ — І ВЫЙГРАЙ ЛЯДОЎНЮ АБО ВЯНДЛЯРНЮ
Ідзе падпіска на «Звязду» на IV квартал 2017 года!
ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

■ Ва ўрадзе

# АРШАНШЧЫНА: У ПОШУКАХ ПУНКТАЎ РОСТУ

**На пасяджэнні Прэзідыума Савета Міністраў пад старшынствам прэм'ер-міністра Андрэя Кабякова разгледзелі ход выканання даручэння кіраўніка дзяржавы па развіцці Аршанскага раёна. Паводле інфармацыі прэс-службы Савета Міністраў, падчас мерапрыемства абмеркаваны два блокі сістэмных пытанняў — аграпрамысловы комплекс і машынабудаўнічыя прадпрыемствы, падначаленыя Мінпраму і Дзяржкамваенпраму.**

Кіраўнік урада нагадаў, што Прэзідэнт даручыў прыняць сістэмныя меры па ліквідацыі наяўных недахопаў у рабоце па развіцці Аршанскага раёна, а таксама дапрацаваць комплексны план, вызначыўшы эканамічна абгрунтаваныя пункты росту, якія прадугледжвалі б паэтапны выхад Аршаншчыны да 2020 года на ўзровень вышэйшы за сярэднеабласны.

Падводзячы вынікі пасяджэння, Андрэй Кабякоў адзначыў, што ў найбліжэйшы час усім зацікаўленым паступіць на ўзгадненне праект праграмы развіцця Аршанскага раёна да 2020 года і комплекс мер па яе выкананні. Таксама кіраўнік урада звярнуў увагу прысутных, што падчас працы над праграмай у першую чаргу трэба падумаць аб пошуку рэзерваў для росту аб'ёмаў і эфектыўнасці па курыраваных напрамках.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.** *kryzhevich@zviazda.by*

■

■ Партнёры

# УСЁ БОЛЬШ ЗБЛІЖАЕМСЯ

## Пасол Казахстана пра адносіны яго краіны з Беларуссю

**У лістападзе нашу дзяржаву плануе наведаць з афіцыйным візітам Прэзідэнт Казахстана Нурсултан Назарбаеў. Пра гэта падчас прэс-канферэнцыі паведаміў Ергалі Булегенаў, Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Казахстана ў Беларусі.**

Падчас сустрэчы з журналістамі дыпламату задалі шэраг пытанняў, вось яго адказы на самыя цікавыя з іх.

### Пра вучэнні «Захад-2017»

— Я занепакоенасці асобных дыпламатаў, дзяржаў не падзяляю, — заявіў пасол. — Гэта тэма даўно ўжо мусіруецца... Мы з'яўляемся членамі Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы, такія вучэнні, якія зараз праводзяць Расія і Беларусь, праводзяцца і ў Казахстане. Яны традыцыйныя і планаваныя. Я жадаю паспяховага правядзення гэтага мерапрыемства.

### Пра супрацоўніцтва рэгіёнаў

— За апошнія гады міжрэгіянальнае супрацоўніцтва актывізавалася, — канстатаваў дыпламат. — Складана пералічыць усе нашы рэгіёны, дэлегацыі якіх пабывалі ў Беларусі на працягу пяці з палавай гадоў маёй працы тут. Дэлегацыі абласцей Беларусі таксама бываюць у Казахстане. У красавіку быў візіт дэлегацыі Паўладарскай вобласці на чале з кіраўніком рэгіёна — акімам вобласці. Яны пабывалі ў Мінску, Мінскай вобласці. На прадпрыемстве, якое выпускае трамваі, быў заключаны дагавор на пастаўку 25 вагонаў трамваяў — амаль на 8 мільёнаў еўра!

### Пра тавараабарот

— Большасць дэлегацый прыязджае з Казахстана ў Беларусь, — звярнуў увагу Ергалі Булегенаў. — У нас таму ўсе гэтыя гады трымаецца добры такі перакос у тавараабароце на карысць Беларусі — каля 90%. Нам бы таксама хацелася, каб казахстанскія тавары сюды паступалі. Думаю, гэта справа часу. У Казахстане цяпер вельмі шмат прадпрыемстваў адкрываецца, і іх прадукцыя — вельмі канкурэнтаздольная.

### Пра сумесныя прадпрыемствы

— У Казахстане нямала праектаў, якія паспяхова працягваюць сваю дзейнасць, — адзначыў дыпламат, гаворачы пра сумесныя прадпрыемствы з Беларуссю на тэрыторыі краіны. — Адзін з такіх праектаў належыць БелАЗу, які на рынку Казахстана з 2009 года. У Карагандзе было створана з БелАЗам сумеснае прадпрыемства — КазБелАЗ. Там не толькі ідзе зборка кар'ернай тэхнікі, але і здзяйсняецца рамонт, тэхнічнае абслугоўванне...

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

■

# Вучэнне — ад слова «вучыць»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*


Фота Надзеі БУЖАН.

Вучэнне будзе праходзіць у два этапы. На першым — аб'яднаным камандаваннем рэгіянальнай групоўкі войскаў мяркуецца ажыццявіць завяршэнне падрыхтоўкі войскаў (сіл) да баявога прымянення па ізаляцыі раёнаў дзеянняў незаконных узброеных фарміраванняў і дыверсійна-разведвальных груп праціўніка. Таксама плануецца нарасціць групоўкі ваенна-паветраных сіл і войскаў проціпаветранай абароны для прыкрыцця важных дзяржаўных і ваенных аб'ектаў, падрыхтавацца да адбівання магчымай агрэсіі, а таксама адпрацаваць пытанні арганізацыі ўзаемадзеяння і ўсебаковага забеспячэння. Падчас другога этапу вучэння вайскоўцы будуць адпрацоўваць пытанні кіравання войскамі (сіламі) у ходзе вядзення ваенных дзеянняў пры адбіванні агрэсіі супраць Саюзнай дзяржавы ва ўмовах абстаноўкі, якая хутка мяняецца, а таксама арганізацыі ўзаемадзеяння і ўсебаковага забеспячэння ў інтарэсах рашэння пастаўленых задач.

У аснову розыгрышу практычных дзеянняў і эпізодаў пакладзены варыянты сумесных дзеянняў беларускіх і расійскіх часцей і падраздзяленняў, якія ўваходзяць у склад рэгіянальнай групоўкі войскаў, пры ўдзеле ў прыкрыцці ўчасткаў дзяржаўнай мяжы, ахове і абароне ваенных аб'ектаў, блакіраванні і ліквідацыі дыверсійна-разведвальных груп і незаконных узброеных фарміраванняў, а таксама вядзення абарончага бою.

Як заўважыў начальнік дэпартамента міжнароднага ваеннага супрацоўніцтва, для выключэння недаверу і напружанасці, акрамя нашых суседзяў (Украіны, Польшчы, Латвіі і Літвы), а таксама Эстоніі, Беларусь у якасці назіральнікаў запрасіла і прадстаўнікоў Швецыі і Нарвегіі. Назіраць за вучэннем будуць прадстаўнікі міжнародных арганізацый, а таксама ваенна-дыпламатычнага корпусу замежных дзяржаў, акрэдытаваных пры пасольствах сваіх краін у Беларусі.

Вучэнне завершыцца 20 верасня. Да 30 верасня асабовы склад, узбраенне, ваенная і спецыяльная тэхніка Узброеных Сіл Беларусі вернуцца ў пункты пастаяннай дыслакацыі, а вайсковыя часці і падраздзяленні Узброеных Сіл Расіі пакінуць тэрыторыю нашай краіны.

А пакуль амаль штодзень карэспандэнты «Звязды» будуць весці рэпартажы з месцаў манеўраў. Самыя свежыя навіны, якія датычацца вучэння, уже змяшчаюцца і на спецыяльным сайце — exercise.mil.by.

**Вераніка КАНЮТА.** *kanyuta@zviazda.by*

# ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### Амерыканская сістэма THAAD у Паўднёвай Карэі ўведзена ў строй



Амерыканская супрацьракетная сістэма THAAD, размешчаная нядаўна на базе Санчжу ў Паўднёвай Карэі, цалкам гатовая да выкарыстання, паведаміў тэлеканал KBS. За заканчэннем работ назіраў камандуючы восьмай сухапутнай арміяй ЗША генерал-лейтэнант Томас Вэндал, які наведаў базу Санчжу, размешчаную ў правінцыі Кёнсан-Пукто. Пра пачатак перакідання элементаў сістэмы THAAD ЗША ў Паўднёвую Карэю паведамлялася ў пачатку сакавіка бягучага года. Рашэнне было прынята пасля таго, як КНДР ажыццявіла запуск чатырох балістычных ракет. Тры з іх упалі ў марской эканамічнай зоне Японіі.

### Юнкер прапанаваў стварыць Еўрапейскае агенцтва па кібербяспецы

Старшыня Еўрапейскай камісіі Жан-Клод Юнкер прапанаваў стварыць Еўрапейскае агенцтва па кібербяспецы. Такая прапанова прагучала падчас выступлення ў Еўрапарламенце ў Страсбургу. Юнкер падкрэсліў, што сёння кіберзлачыннасць уяўляе вялікую пагрозу. Паводле яго слоў, у апошні час узмоцнена барацьба супраць прапаганды тэрарызму ў інтэрнэце. Але пры гэтым, як прызнаў Юнкер, «Еўропа дрэнна аснашчана перад пагрозай кібератакі, якая ўяўляе небяспеку для стабільнасці дэмакратыі, эканомікі».

### Прэзідэнтам Сінгапура ўпершыню стала жанчына

Новым прэзідэнтам Сінгапура стала Халіма Якаб, якая да нядаўняга часу з'яўлялася спікерам парламента. Пра гэта паведаміў старшыня выбарчай камісіі Эн Вай Чун пасля праверкі ўсіх прадстаўленых ёю штабам дакументаў. Такім чынам, 63-гадовая Якаб стала першай жанчынай — прэзідэнтам краіны, а таксама першым за 47 гадоў прадстаўніком малайскай абшчыны, які заняў гэтую пасаду. У той жа час улада прэзідэнта ў Сінгапуры абмежаваная, а краінай фактычна кіруе прэм'ер-міністр. Урадавыя рашэнні аспрэчваюцца рэдка, а галоўная роля прэзідэнта — разгляд прашэнняў аб памілаванні ад прысуджаных да смяротнага пакарання зняволеных.

### Названы самыя негасцінныя краіны свету



Афганістан, КНДР, Самалі, Сірыя і Туркменістан узначалілі спіс самых негасцінных краін. Як вынікае з рэйтынгу партала Passport Index, у гэтых дзяржаў няма пагадненняў аб бязвізавым уездзе. Другі радок заняла Ангола, якая дае бязвізавы ўезд толькі турыстам з Намібіі. На трэцім месцы аказаліся Бутан, Экватарыяльная Гвінея, Эрытрэя, Ірак і Лівія, якія пускаюць да сябе без віз падарожнікаў з трох краін. Усяго ў рэйтынгу ўлічваліся даныя па 198 краінах і тэрыторыях свету. Раней Passport Index склаў спіс самых гасцінных краін. У іх лік увайшлі Каморскія астравы, Кот-д'Івуар, Гвінея-Бісаў, Мадагаскар, Мальдывы і іншыя дзяржавы, якія не абмяжоўваюць уезд на сваю тэрыторыю.

■ Нябачныя масты

# Кітайская мова выйдзе за сцены сталічных школ

## Цэнтр кітайскай культуры і пісьменства ўрачыста адкрыўся ў сталічнай гімназіі №12

**У падарунак ад пасольства Кітайскай Народнай Рэспублікі ў Рэспубліцы Беларусь навучальная ўстанова атрымала сучасны камп'ютарны клас.**

Класы па вывучэнні кітайскай мовы з'явіліся ў 12-й гімназіі адзінаццаць гадоў таму, а сёлета адбыўся першы выпуск навучэнцаў, якія пачалі спасцігаць азы мовы Паднябеснай з першага класа.

Сёння 150 дзяцей з 3-га па 11-ы клас вывучаюць кітайскую мову як першую замежную і каля 200 вучняў асвойваюць яе факультатыўна.

Гімназісты з'яўляюцца пераможцамі алімпіяд і шматлікіх конкурсаў па кітайскай мове, напрыклад фестывалю «Дыялог культур», конкурсу «Акно ў Паднябесную» і іншых. Навучэнцы ездзяць па абмене ў Кітай. Зусім нядаўна яны адпачывалі ў міжнародным летнім лагеры ў Пекіне. Установа часта прымае гасцей з пасольства КНР у Беларусі. Тут працуюць і выкладчыкі з Кітая. У адукацыйным працэсе выкарыстоўваюцца як айчынныя, так і кітайскія дапаможнікі. А некалькі гадоў таму ў абітурыентаў з'явілася магчымасць здаваць па кітайскай мове ЦТ.

— Сёння, калі ў нас павялічваецца тавараабарот з Кітайскай Народнай Рэспублікай, калі мы актыўна развіваем інвестыцыйную дзейнасць у рамках праграмы «Вялікі Шаўковы шлях» і стварэння парка «Вялікі камень», кітайская мова становіцца надзвычай актуальнай для ажыццяўлення эканамічнай дзейнасці, — адзначыў падчас урачыстай цырымоніі адкрыцця цэнтра **міністр адукацыі Ігар КАРПЕНКА**.

Сумесна з КНР у нас рэалізуецца шэраг адукацыйных праектаў. Зусім нядаўна адбыўся візіт міністра адукацыі Кітая ў нашу краіну. Гэта быў першы візіт за ўвесь час суверэннага развіцця Беларусі. Тады ў межах форуму рэктараў вышэйшых навучальных устаноў былі падпісаны шэраг пагадненняў у галіне адукацыі, якія закранаюць не толькі пытанні вывучэння кітайскай мовы, але і сумесныя навуковыя даследаванні, адукацыйную дзейнасць з выдачай двайных дыпломаў, шырокі спектр стажыровак як кітайскіх, так і беларускіх студэнтаў.

— Задача сістэмы адукацыі — стварыць умовы для таго, каб кітайская мова вывучалася, каб яна была запатрабаванай у розных відах дзейнасці: не толькі ў эканамічнай, але і ў культурнай, адукацыйнай, творчай. Мы ставім задачу, каб у рэгіёнах былі базавыя школы, дзе б вывучалася кітайская мова як вучэбны прадмет, — падкрэсліў Ігар Карпенка. — Таму адкрыццё цэнтра кітайскай культуры і пісьменства — знакавая падзея, новы адпраўны пункт для руху наперад у гэтым напрамку. Пераканаmakes, што напрацоўкі, вопыт і веды, якія ёсць у педагогаў гімназіі, паспрыяюць выхаду кітайскай мовы за сцены сталічных школ у рэгіёны і дапамогуць у падрыхтоўцы педагагічных кадраў.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

■

ФАКТЫ | ПАДЗЕІ | НАВІНЫ

## Стаўка рэфінансавання стала ніжэйшай

**Нацыянальны банк Беларусі з 13 верасня знізіў стаўку рэфінансавання з 12% да 11,5% гадавых.**

Сёмае за год зніжэнне стаўкі стала магчымае дзякуючы памяншэнню фактычнай інфляцыі і адсутнасці значных рызык для паскарэння росту цэн у перспектыве. Тэмпы росту грашовай прапановы застаюцца ўмеранымі і адпавядаюць попыту эканомікі на фоне аднаўлення дзелавой актыўнасці, упэўнены ў Нацбанку.

Акрамя таго, з гэтай даты стаўкі па пастаянна даступных і двухбаковых аперацыях падтрымкі ліквіднасці банкаў знізіліся з 14% да 13% гадавых.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## Для лячэння і прафілактыкі

### Неўралагічнае аддзяленне Пружанскай бальніцы атрымала новы корпус

**І гэта, несумненна, стала падзеяй для раёна. Таму што ранейназванае аддзяленне бальніцы знаходзілася ў даваенным будынку, да таго ж за 400 метраў ад асноўнага корпуса бальніцы.**

Новы трохпавярховы корпус сумешчаны з палiклiнiкай, аснашчаны ліфтам і ўсім неабходным для абслугоўвання людзей з абмежаванымі магчымасцямі. Акрамя неўралогіі, тут размясціліся аддзяленне перaлiвання крыві, рэнтгеналагічная служба, а таксама кабінеты ўльтрагукавой дыягностыкі, лячэбнай фізкультуры, фізіятэрапеўтычны. На другім паверсе частка памяшкання адведзеная пад палаты тэрапеўтычнага профілю.

Паводле інфармацыі **галоўнага ўрача цэнтральнай раённай бальніцы Віктара ДАРАНЕВІЧА,** аддзяленне разлічана на 60 ложкаў. Гэта двух-, трох- і чатырохмесныя палаты блочнай сістэмы з асобнымі душавымі і санвузламі. Ёсць таксама чатыры палаты павышанай камфортнасці для аказання платных паслуг.

Будаўніцтва абышлося абласному бюджэту ў 3,7 мільёна рублёў, з іх 500 тысяч пайшло на абсталяванне. На некаторыя віды медыцынскага аснашчэння ахвяравалі сродкі мясцовыя прадпрымальнікі.

Павіншаваць пружанцаў са знамянальнай падзеяй прыехаў **старшыня Брэсцкага аблвыканкама Анатоль ЛІС.**

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

## У сталіцы выбіраюць найлепшую мэблю

**Міжнародная спецыялізаваная выстаўка-кірмаш «Мэбля-2017» пачала сваю работу ў Мінску. У Футбольным манежы наведвальнікі змогуць убачыць мэблю ад найбуйнейшых прадпрыемстваў краіны, якую размясцілі на плошчы больш за 3,2 тысячы квадратных метраў. Экспазіцыя будзе працаваць сваю працу да 16 верасня.**

На мерапрыемстве прысутнічаюць новыя мадэлі корпуснай і мяккай мэблі, абноўленыя лінейкі дэкораў драўняных пліт, якія выкарыстоўваюцца для вытворчасці. Наведвальнікі могуць выбраць мэблю для гасцінай, спальні, кухні, дзіцячай, ваннага пакоя, саду. Праграма выставачнага мерапрыемства прадугледжвае як прэзентацыі прадпрыемстваў, так і распродажы.

Акрамя таго, на выстаўцы падвядуць вынікі першага рэспубліканскага конкурсу праектаў прамысловага дызайну ў мэблевай галіне. На ім будуць разглядаць 25 дызайнерскіх праектаў. Убачыць узнагароджванне пераможцаў і лаўрэатаў магчыма сёння ў 13 гадзін на галоўнай сцэне. Таксама традыцыйна будуць абвешчаныя пераможцы конкурсу «Найлепшае мэблевае прадпрыемства года» і «Найлепшая мэбля Беларусі — 2017». Дзелавая праграма выстаўкі таксама прадугледжвае тэматычныя семінары, канферэнцыі і міжнародныя бізнес-сустрэчы.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.**

## Гуляць у рулетку ў інтэрнэце — толькі з 21 года?

**Міністэрства па падатках і зборах выносіць на грамадскае абмеркаванне праект указа, які рэгулюе ўтрыманне віртуальных ігральных устаноў і правядзенне азартных гульняў у інтэрнэце.**

У прыватнасці, праектам дакумента прадугледжваецца, што арганізоўваць і праводзіць азартныя гульні з дапамогай віртуальнай ігральнай установы маюць права толькі тыя, хто атрымаў спецыяльны дазвол (ліцэнзію). Таксама прапануецца вызначыць абавязковыя патрабаванні і ўмовы як для атрымання ліцэнзіі, так і для ўтрымання такой установы.

Акрамя таго, праект указа ўводзіць забарону на допуск у казіно (у тым ліку віртуальнае) асоб, маладзейшых за 21 год. У прыватнасці, у праекце ўказа гаворыцца, што ўлічваючы спецыфіку дзейнасці ў сферы ігральнага бізнесу (высокія рызыкі ўключэння ў азартныя гульні асоб, якія не дасягнулі 18 гадоў, фарміравання ў фізічных асоб гульнявой залежнасці, што негатыўна адбіваецца на псіхічным здароўі чалавека і ў сям'і), а таксама міжнародны вопыт, уводзіцца забарона на допуск у ігральныя ўстановы (віртуальную ігральную ўстанову) і (або) да ўдзелу ў азартных гульнях асоб, якія не дасягнулі 21-гадовага ўзросту.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## «Змяіны» рэйс

**Больш за 50 змей было знойдзена ў ручной паклажы грамадзяніна Расіі ў Нацыянальным аэрапорце Мінск.**

Для праверкі аператыўнай інфармацыі пагранічнікі спынілі 36-гадовага расіяніна. Ён у ліку іншых пасажыраў рэйса Вена — Мінск праходзіў пагранічны кантроль. Па інфармацыі Дзяржпагранкамітэта, у ручной паклажы жыхара Расіі супрацоўнікі мытні знайшлі 54 змяі, пяць яшчарак, 25 павукоў і дзевяць скарпіёнаў. Мужчыну перадалі супрацоўнікам мытні, а змесціва паклажы накіравалі на экспертызу.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

«ГАРАЧЫ» 287 17 41

# «Дапамажыце прызнаць карову здаровай...»

МІЖ ІНШЫМ, ЖЫВЁЛА ХВОРАЯ НА ТУБЕРКУЛЁЗ



**Сапраўдная дэтэктыўная гісторыя (а ў пэўным сэнсе можна сказаць, што дзесьці ледзьве і не паўкрымінальная) цягам доўгага часу разгортваецца вакол прыватнай каровы ў адной з вёсак Нясвіжскага раёна. У яе апынуліся ўцягнутымі вельмі шмат службовых асоб, родныя нашай заяўніцы... У раёне (ды і ў вобласці) пра гэтую гісторыю добра ведаюць, тым не менш мы вырашылі не называць галоўную яе фігурантку. Але напачатку паслухаем саму пажылую заяўніцу, якая патэлефанавала ў рэдакцыю па нумары гарачай лініі. Яе аповед быў эмацыянальным і адначасова блытаным.**

— 27 мая мінулага года ў прыватным сектары правяралі кароў — бралі аналізы, ці здаровыя яны. Мая рагуля паказала на туберкулёз... Але яна і цяпер жыве, здаровая, расцялілася. Раней я зарабляла на малацэ, але потым мне тое забаранілі. Вы ж не падумайце, я ж таксама сумняваюся, але калі з жывёлай усё добра, дык чаму?.. Нядаўна выпісалі штраф — тры базавыя велічыні... А я ў сакавіку мужа пахавала, як заплаціць... Думала, што пойдуць мне на ўступкі, праверaць зноў карову, скажуць, што яна здаровая, змагу зноў малако здаваць, — даводзіла нам жанчына.

Як вынікае са слоў заяўніцы, здаровая рагуля толькі паводле яе ўласнага пераканання: ветэрынары яшчэ летась пацвердзілі, што жывёла хворая, больш ніякіх даследаванняў не праводзілася (забагаючы наперад — і не павінна было праводзіцца). Калі гаворка ідзе пра такую хваробу, як туберкулёз, першае, што прыходзіць у галаву, — а чым чалавек увогуле думае? Тут жа нават не спецыялісту ўсё зразумела. А вось уладальніца каровы — не, таму і працягваецца гэтая гісторыя так доўга. І ніякіх мераў уздзеяння акрамя адміністрацыйных да жанчыны не выкарыстаеш, бо тая карова — прыватная ўласнасць. Якая, між іншым, уяўляе небяспеку...

— Гэты выпадак знаходзіцца на кантролі, ён сапраўды адзіны ў вобласці, — сказаў **галоўны дзяржаўны ветэрынарны інспектар Нясвіжскага раёна Сяргей СТРЭЧАНЬ,** да якога мы звярнуліся па каментарыі. — Сапраўды, у маі мінулага года ў рамках кантролю за асабліва небяспечнымі інфекцыйнымі захворваннямі, да якіх адносіцца і туберкулёз, мы праводзілі праверку прыватнага статка ў вёсцы, дзе жыве ваша заяўніца. У яе каровы аналізы былі станоўчымі (я сваімі словамі пераказваю адказ Сяргея Ільіча, і надалей апускаючы спецыфічныя для звычайнага чалавека тэрміны. — **Аўт.**) Ёсць ветэрынарна-санітарныя правілы па туберкулёзе, зацверджаныя Мінсельгасхарчам, яны павінны выконвацца як закон. Пры станоўчай рэакцыі жывёла абавязкова падлягае здачы на дыягнастычны забой.

Аднак, як расказаў далей Сяргей Ільіч, уладальніца рагулі заняла катэгарычную пазіцыю: «Я здаваць не буду!» Якой, як відаць, яна прытрымліваецца дагэтуль. Былі і ўгаворы, і шматлікія размовы, колькі толькі службовых асоб не наведвала жанчыну, усё марна. Прыязджаў маці ўгаворваць нават сын, таксама нічога не атрымалася. Абяцалі і іншую рагулю дапамагчы выпісаць. Але пакуль быў жывы муж жанчыны, ён заяўляў, маўляў, люблю толькі сваё малако! Але калі на сваю рызыку чалавек можа ўжываць такі прадукт, дык нельга забывацца і пра бяспеку для іншых.

Жанчыне цалкам справядліва і на законных падставах забаранілі здачу малака, выпас каровы разам з іншымі жывёламі. Не трэба асабліва тлумачыць, чым гэта можа абярнуцца... Аднак уладальніца рагулі спрабавала праз іншых людзей аддаваць на рэалізацыю малако, за што лабарант атрымаў папярэджанне. Зноў жа нейкім паўлегальным чынам карова была пакрытая, за што ўжо вымову атрымаў галоўны ветурач гаспадаркі — за дапамогу пры ацёле. Як расказаў далей Сяргей Стрэчань, у гэтай сітуацыі, магчыма, ёсць і віна калег. Нехта з іх мог сказаць, што пры паўторным даследаванні ранейшы аналіз можа не пацвердзіцца. Але, як мы сказалі на самым пачатку, гэта выключана — паўторныя даследаванні ў выпадку станоўчага першага аналізу не праводзяцца.

— Жанчыну выклікалі на адміністрацыйную камісію, аднак яна не прыехала. Таму было вынесена рашэнне аб штрафе ў памеры трох базавых велічынь (хоць штраф можа быць да 20 базавых), — сказаў Сяргей Ільіч. — Чарговы раз уладальніцу каровы папярэдзілі: рагулю трэба здаць. Вельмі хацелася б, каб чалавек нарэшце прыслухаўся да здаровага сэнсу і азбукі бяспекі...

**Сяргей РАСОЛЬКА.** rs@zviazda.by

# ХОЧАЦЕ ПАДЗЯЛІЦЦА СВАІМІ ВЕДАМІ?

## Мінскі ўніверсітэт трэцяга ўзросту шукае валанцёраў

**Наша газета не раз пісала пра гэты адукацыйны праект, дзякуючы якому кожны год больш за тысячу мінскіх пенсіянераў успамінаюць, што значыць быць студэнтам. У Мінскім універсітэце трэцяга ўзросту яны вывучаюць замежныя мовы, ландшафтны дызайн, аратарскае майстэрства, краязнаўства, псіхалогію, асвойваюць камп'ютар і Android, фоташоп і відэамантаж, фотасправу, спрабуюць сябе ў акцёрскім мастацтве, танцавальных і спартыўных напрамках...**

І ўсё гэта трымаецца на выкладчыках-валанцёрах, якія працуюць са слухачамі «залатога ўзросту» абсалютна бясплатна.

На гэтым тыдні стартавала чарговая кампанія па наборы валанцёраў у Мінскі ўніверсітэт трэцяга ўзросту.

— Валанцёр можа стаць выкладчыкам як ужо наяўнага курсу, так і прапанаваць новы вучэбны напрамак. Заняткі праходзяць адзін раз на тыдзень, з кастрычніка па май, — кажа **спецыяліст па камунікацыях Беларускай асацыяцыі сацыяльных работнікаў Вольга ШЫШЛО.** — І не хвалюйцеся, калі ў вас няма вопыту выкладання, галоўнае — гэта жаданне падзяліцца сваімі ведамі, з ім усё атрымаецца!

Валанцёр Мінскага ўніверсітэта трэцяга ўзросту Надзея Дземідко ўспамінае: «Спачатку было крыху складана, бо да прыходу ў праект я ніколі не выкладала. Ды і мае вучні паставіліся да мяне з недаверам: я ім падалася занадта «зялёнай» і непрактыкаванай. Але паступова заняткі пачалі атрымлівацца насычанымі і цікавымі. Калі яны кажуць: «Ой, дзякуючы вашым урокам я за мяжой размаўляла, і мяне не толькі разумелі, але і хвалілі маю англійскую мову!» — то для мяне гэта найлепшая пахвала».

— Паспрабаваць працаваць з пажылымі людзьмі я б парэкамендавала выкладчыкам, якія расчараваліся ў сваёй прафесіі. У вас сапраўды адкрыецца другое дыханне! — раіць Вераніка Дабракова. — Ды і наогул, гэта вопыт, які варта мець.

* * *

Фарміраванне каманды валанцёраў працягнецца да 18 верасня. Ахвотныя могуць падаць заяўку, напісаўшы кіраўнікам праекта на 3-age@basw-ngo.by, або запоўніць анкету валанцёра. У камандзе праекта будуць рады бачыць не толькі студэнтаў, але і спецыялістаў, якія працуюць, і пенсіянераў.

**Святлана БУСЬКО.** busko@zviazda.by

**Извещение о проведении повторного аукциона**

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | ОАО «МЭТЗ ИМ. В. И. КОЗЛОВА», г. Минск, ул. Уральская, 4 |

**Предмет аукциона**

**Объекты недвижимого имущества, реализуемые одним лотом, расположенные по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Нововетреная, д. 11А**

| Наименование | Назначение | Общая площадь | Инвентарный номер |
|---|---|---|---|
| **Здание гаража** | Здание специализированное автомобильного транспорта | 89,8 кв. м | 350/С —78786 |
| **Здание конторы** | Здание административно-хозяйственное | 238,8 кв. м | 350/С —78596 |

| | |
|---|---|
| **Составные части и принадлежности** | Мезонин, две каркасно-засыпные пристройки, подвал, сход в подвал, крыльца, забор, проезжая часть |
| **Сведения о земельном участке** | Земельный участок, общей площадью 0,1376 га, предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для содержания и обслуживания административного здания Гомельского хозрасчетного ремонтно-строительного участка |

**Начальная цена с НДС 20 % — 51 978,31 белорусских рублей (снижена на 70%)**

**Задаток 10%** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях (BYN) перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области, г. Минск, ул. Коллекторная, 11 БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа: ЗАО «Центр промышленной оценки»

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **10** рабочих дней после проведения аукциона |

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by.

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» 14.07.2017

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения аукциона** | **18.10.2017** в 14.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Дата и время окончания приема документов** | **16.10.2017** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Контактные телефоны** | +375 17 280-36-37; +375 29 317-95-42. Email: auction@cpo.by |

■ Жыллё маё

# ТАРЫФЫ «ПІКАВЫХ» ГАДЗІН

## на энергію электрычную, атамную і аднаўляльную

**З пачаткам работы беларускай атамнай электрастанцыі тарыфы ў краіне плануецца дыферэнцыраваць. Пры гэтым кошт электраэнергіі ў залежнасці ад часу сутак можа адрозніваца ў тры разы. Міркуецца таксама размежаваць для насельніцтва цэны адпаведна часу пікавых нагрузак і пры налічэнні аплаты за падагрэў вады і ацяпленне і пашырыць групы спажыўцоў, якія могуць разлічвацца па субсідаваным тарыфе.**



Фота БЕЛТА

### Стымул для карыстання

Па словах спецыялістаў, дыферэнцыяцыя тарыфаў разлічана на тое, каб грамадзяне не пацярпелі ад падаражэння жыллёва-камунальных паслуг (ЖКП).

— З улікам таго, што па большасці ЖКП мы выходзім на 100-працэнтны ўзровень кампенсацыі, індэксацыя на намінальную зарплату, якая праводзіцца сёння, да іх прымяняцца па заканадаўстве не можа. Разам з тым з цягам часу мы можам сутыкнуцца з тым, што затраты на аказанне гэтых паслуг вырастуць і дасягнуць ўзровень 100-працэнтнай кампенсацыі выконвацца не будзе, — заўважыў **Іван ВЕЖНАВЕЦ, намеснік міністра антыманапольнага рэгулявання і гандлю (МАРГ).**

Сумесна з Міністэрствам жыллёва-камунальнай гаспадаркі МАРГ прапрацоўвае падыходы па магчымай індэксацыі тарыфаў у залежнасці ад затрат, якія ўваходзяць у пэўную паслугу. Прапановы будуць накіраваны для разгляду кіраўніку дзяржавы, бо для разліку тарыфаў спатрэбіцца мяняць базавую велічыню. Папярэдне разлічаны тарыф на энергію ад АЭС таксама накіраваны на разгляд кіраўніцтва краіны.

Каб стымуляваць карыстанне электраэнергіяй, прапрацаваны і дыферэнцыраваныя ў залежнасці ад пікавых і звычайных гадзін тарыфы для электракацельняў, запланаваных да ўводу.

— Узгодненыя значэнні будуць прымяняцца на эксперыментальных электракацельнях, — запэўніў прадстаўнік МАРГ. — А каб дыферэнцыраванымі тарыфамі мелі магчымасць карыстацца жыхары, неабходна ўсталёўваць у дамах адпаведныя лічыльнікі.

### Энергазатратныя работы — па начах!

**Міхаіл МЯСНІКОВІЧ, старшыня Савета Рэспублікі,** заклікаў спецыялістаў адпаведных міністэрстваў падумаць, што зменіцца ў тарыфнай палітыцы з уводам беларускай АЭС, і падкрэсліў неабходнасць удасканалення тарыфнай палітыкі (тарыфнага сшытка) на цеплавую і электраэнергію:

— Ва ўсім свеце сёння стымулююць прымяненне ільготных тарыфаў для насельніцтва ў няпікавыя гадзіны. У грамадства вялікія чаканні значнага зніжэння ставак з уводам АЭС, таму дыферэнцыяцыяй тарыфаў трэба займацца глыбока. У свеце, напрыклад, мыюць толькі ноччу, бо тады кошт ніжэйшы. У нас цана на электраэнергію пакуль не адчувальная для людзей. Аднак калі гэты паказчык наблізіцца да 100% кампенсацыі, чалавеку трэба даць магчымасць выконваць энергазатратныя работы па доме ў зручны для яго час па меншым кошце.

**Віктар КАРАНКЕВІЧ, першы намеснік міністра энергетыкі,** паведаміў, што рыхтуецца праект пастановы ўрада, дзе прадугледжана пашырэнне груп спажыўцоў, якія карыстаюцца электраэнергіяй для гарачага водазабеспячэння і разлічваюцца па субсідаваным тарыфе ў залежнасці ад аб'ёмаў карыстання электраэнергіяй. Міркуецца, напрыклад, дазволіць інвалідам і непрацуючым пенсіянерам, якія зарэгістраваны ў жыллі па месцы знаходжання, у тым ліку ў садовых доміках, разлічвацца за газазабеспячэнне для ацяплення і за звадкаваны газ у 50-літровых балонах па субсідаваных дзяржавай цэнах на газ у залежнасці ад аб'ёмаў карыстання:

— З 1 студзеня 2017-га для насельніцтва зніжаны тарыф на электраэнергію для патрэб ацяплення і гарачага водазабеспячэння з далучанай сумарнай магутнасцю абсталявання больш за 5 кВт, і гэтым грамадзяне ўжо карыстаюцца, — адзначыў ён. — Эфект ад мерапрыемстваў па зніжэнні сабекошту склаў за 2011—2016 гг. 800 млн рублёў без уліку зніжэння затрат ад змяншэння цаны на імпартаваны прыродны газ. Падобныя мерапрыемствы зацверджаны і на гэты год. Міркуецца, гэта зменшыць затраты прыкладна на 100 млн рублёў.

**Ірына СІДАРОК.** *sidarok@zviazda.by*

■ Эканамікс

# Банкі загаварылі па-беларуску... з уладальнікамі смартфонаў

## А мабільная праграма прэтэндуе на статус першага ў Беларусі лічбавага банка

**Фінансавым паліглотам стаў Альфа-Банк, які пачаў размаўляць праз мабільны банкінг на беларускай мове. На ім загаварыла праграма Insync.by, якой цяпер карыстаюцца больш за 80 тысяч чалавек.**

Мабільны банк навучыла размаўляць па-беларуску вераснёўскае абнаўленне. Уладальнікі смартфонаў на OS Android і iOS могуць выбраць родную мову ў наладках. Пасля гэтага ўся камунікацыя будзе ісці па-беларуску. Пры жаданні можна карыстацца версіямі праграмы на рускай альбо англійскай мове. Insync.by таксама атрымала падвойныя карткі «А-Курс Pro»: адну — у беларускіх рублях, другую — у доларах. Абедзве карткі дастаўляюць кур'ерам дадому, наведваць аддзяленне банка не трэба. Іх уладальнік можа прадаваць і набываць валюту па аднолькавым курсе, які заўсёды застаецца найлепшым на рынку. Таксама ў банку падвоілі ліміты на абмен валюты і павялічылі кэшбэк, які зараз складае 1%.

Карыстальнікі мабільнага банка цяпер могуць бясплатна перавесці на свой рахунак да 6000 рублёў. Грошы можна перакінуць з карткі любога банка. Зараз гэта можна зрабіць і праз WebPay непасрэдна ў праграме. Яна прэтэндуе на статус першага ў Беларусі лічбавага банка. Ён ужо дазваляе кіраваць рахункамі ў любых валютах і весці ўлік гульнявога золата па кабрэндынгавых картках сусвету Wargaming. Цяпер таксама можна заказаць бонусную картку Alfa-life і аформіць віртуальную картку ёCard для бяспечнай пакупкі ў інтэрнэце. Усё гэта цяпер можна зрабіць са смартфона.

«Па сутнасці, Insync.by выходзіць за рамкі звыклага ўсім мабільнага банка. З яе дапамогай ужо можна адкрываць рахункі, мяняць валюту, аплачваць плацяжы і пераводзіць грошы са смартфона. Ва ўладальнікаў праграмы практычна няма неабходнасці наведваць банкаўскія аддзяленні», — падкрэсліла кіраўнік па электронным бізнесе Альфа-Банка (Беларусь) Вольга ФІЛІПЕНКА.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

# ДАБРЫНЯ СА СМАКАМ КАВЫ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Сваю кавярню маладыя лідчане хочуць бачыць месцам, дзе можна сустрэцца з сябрам ці сяброўкай, зайсці дружнай кампаніяй ці, наадварот, паглыбіцца ў свой віртуальны свет, заказаўшы кубачак кавы. Такіх устаноў у горадзе вельмі мала, лічыць Дзмітрый. У асноўным прапаноўваюць піва ці больш моцны алкаголь. Новая кавярня мае намер змяніць гэтыя звычкі і нават стварыць канкурэнцыю такім установам. Вядома, гэтаму паспрыяе і месца — у цэнтры горада, непадалёку ад знакамітага Лідскага замка. Праўда, гэта адбіваецца на арэндзе памяшкання — кошт, кажуць уладальнікі, завышаны. Магчыма, таму, што рынак камерцыйнай нерухомасці даволі абмежаваны.



**Дзмітрый ВЕРУН, уласнік інвазійнай кавярні.**

Па словах барыста Дзмітрыя, кавярня становіцца папулярнай у старшых школьнікаў. Вядома ж, заходзяць сюды людзі розных узростаў. Лідчане Уладзімір і Іван называюць сябе пастаяннымі наведвальнікамі, якіх вабяць модны інтэр'ер, музыка, утульная абстаноўка. Кажуць, што кошт кавы ім па кішэні, а сюды зайшлі пасля заняткаў у каледжы.

Аб тым, што тут будуць працаваць людзі з інваліднасцю, яны чулі і Аляксандра Аўдзевіча добра ведаюць. Ён вядомы ў Лідзе і сваімі тэлепраектамі, і актыўнай жыццёвай пазіцыяй. Не так даўно аб ім даведаўся цэлы кантынент — Аляксандр здзейсніў вандроўку па Еўропе на хэндбайку (ручны веласіпед). А ў канцы жніўня Саша прыняў удзел у інклюзіўным веламарафоне праз Беларусь, які арганізавала прадстаўніцтва ААН.

Зараз Аляксандр Аўдзевіч збірае групу людзей з інваліднасцю для работы ў новай кавярні. Вучыць іх прафесіі барыста будуць Дзмітрый і Кірыл — бізнесмены і сябры ініцыятыўнага хлопца. Для іх сацыяльны праект — гэта магчымасць зрабіць нешта большае, чым проста зарабіць грошы. Бо добрыя пачуцці ёсць у кожнага, і часам трэба дапамагчы іх праявіць.

...А пачынаецца справа з усталявання пандуса. Па ім інваліды-калясачнікі будуць самастойна падымацца на сваё працоўнае месца, каб у якасці барыста прыгатаваць каву-эспрэса сваім наведвальнікам. Плануецца набраць групу для навучання да канца верасня.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.** *margo@zviazda.by*

# ЯБЛЫКІ — У СОК І ДЖЭМ



**У нарыхтоўшчыкаў пачаўся пікавы сезон — здатчыкі дастаўляюць яблыкі, бульбу, капусту, грыбы... Прадпрыемствы спажыўкааперацыі ўсіх абласцей гатовыя тонамі набываць у насельніцтва ўсе лішкі сельгаспрадукцыі новага ўраджаю.**

— Зараз — сезон збору яблыкаў, — расказвае таваразнавец Горацкага райспажыўтаварыства Наталля Зэйдзіна. — І хоць, на першы погляд, сёлета не ўрадзіла, людзі актыўнічаюць. Напрыклад, у жніўні мы атрымалі на 200 тон больш чым леташні збор. Чакаем добрую здачу і ў верасні. Бо цана на ападышы цяпер даволі высокая — 20 капеек за кілаграм (у параўнанні з леташнім годам — 5 капеек, больш у чатыры разы!).

У Горацкім раёне — восем прыёмна-нарыхтоўчых пунктаў, чатыры з іх — на сяле. Аднолькава актыўна здаюць і гарадскія, і сельскія жыхары.

— Калі б не прыехалі, давялося б лішкі яблыкаў выкідаць. Дома жанчыны і соку ў дастатку закаталі, і павідла наварылі, ды і наеліся ўжо, — кажуць здатчыкі. Атрымаўшы па 50—60 рублёў, задаволеныя ад'язджаюць.

— Нехта і адзін мех на веласіпедзе прывязе, а нехта, бачыце, і сто! А гэта дзве тоны, — гаворыць нарыхтоўшчык Антаніна КАВАЛЕНКА. — Вось і сёння за дзве гадзіны — шэсць тон навезлі. Чакаем машыну, якая забярэ яблыкі на перапрацоўку.

Наперадзе ў нарыхтоўшчыкаў — бульба і грыбы. Але яблыкі — самая ходавая сельскагаспадарчая культура.

**Марына БЕГУНКОВА.** *begunkova@zviazda.by*

**Фота аўтара.**

*Горацкі раён.*



ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
14 верасня 2017 г.
Чацвер
№17 (15824)
Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

Імёны

# INTELLIGENCY: «Робім тое, што ніхто не спрабаваў»


Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Злева направа: вакаліст Усевалад Доўбня, клавішнік Юрый Тарасевіч і гітарыст Яўген Мурашка.

**Выпраўляючыся на іх выступленне, ніколі не ведаеш, ці пазнаеш у электронным выкананні сваю любімую кампазіцыю. Справа ў тым, што хлопцы граюць у фармаце імправізацыі right now — кожная з песень фактычна зноў нараджаецца, ствараецца на вачах. Электронны гурт Intelligency менш як паўгода таму прадставіў новы поўнафарматны альбом Techno Blues, у гэтым фестывальным сезоне паспеў выступіць на некалькіх буйных тусоўках і рыхтуецца да вялікага начнога фэсту электроннай музыкі. Пра сваю фірменную імправізацыйнасць, нацыянальнае ў музыцы і заняпад андэграўнду разам з нашым карэспандэнтам сёння разважаюць вакаліст Усевалад ДОЎБНЯ, гітарыст Яўген МУРАШКА і клавішнік Юрый ТАРАСЕВІЧ.**

***— Вы называеце сябе не проста гуртом, а электронным live міні-аркестрыкам. Чаму менавіта так?***

**Юрый:** — Бо мы спрабуем рабіць тое, што яшчэ ніхто не спрабаваў. Адны з першых у Беларусі сумясцілі электроніку з жывымі сімфанічнымі інструментамі.

**Усевалад:** — Мы ўвесь час эксперыментуем з наборам гэтых інструментаў. У нас заўсёды былі жывыя духавыя, і струнныя, гітары, бас заўсёды. У гурце адыграла недзе з два дзясяткі чалавек. Увесь час змяняем склад і інструменты, партыі. І невядома, куды гэта ўсё прывядзе. З апошняга, што хочацца паспрабаваць, — у якасці бэк-вакалістак запрасіць дзвюх чарнаскурых дзяўчат. Мы іх шукаем.

***(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)***

Бачыць мэту

# ІНІЦЫЯТЫВАМ — ЗЯЛЁНАЕ СВЯТЛО

## Як у бізнес-інкубатары БДУІР вырошчваюць маладыя таленты

**Калі вы дзесьці ўбачыце статак кароў, а пасярод яго будуць хадзіць людзі з планшэтамі ці смартфонамі і штосьці здымаць, не спяшайцеся ўсміхацца. Вы не сталі сведкам флэшмоба. І ніхто не спрабуе зрабіць фота рагуль сабе на памяць. Хутчэй за ўсё, гэта будзе азначаць толькі адно: у каманды стартапа БДУІР атрымалася давесці сваю ідэю да лагічнага завяршэння...**




Сяргей Краўцоў: «Спосаб бескантактнага ўзважвання не толькі зэканоміць час, але і пазбавіць жывёл ад непатрэбнага стрэсу».

### Лектар — на відэасувязі

Новы навучальны год у Беларускім дзяржаўным універсітэце інфарматыкі і радыёэлектронікі распачаўся з доўгачаканага наваселля. Напярэдадні святкавання 950-годдзя сталіцы на вуліцы Казлова, 28 адбылося адкрыццё восьмага вучэбна-лабараторнага корпуса БДУІР. Яго будаўніцтва распачыналася за бюджэтныя грошы, праект быў унесены ў Дзяржаўную інвестыцыйную праграму, але праз некалькі гадоў фінансаванне спынілася з эканамічных прычын.

— Дабудоўвалі аб'ект мы ўжо за свае грошы. Будаўніцтва абышлося ў 46 мільярдаў недэнамінаваных рублёў, прыкладна 20 мільярдаў з іх — бюджэтныя сродкі, астатняе — пазабюджэтныя сродкі ўніверсітэта. Затое сёння мы можам пахваліцца стварэннем суперсучаснага адукацыйнага асяроддзя — менавіта тут будуць рэалізаваныя самыя інавацыйныя рашэнні ў адукацыі, — адзначыў падчас урачыстай цырымоніі адкрыцця новага корпуса **рэктар БДУІР, прафесар Міхаіл БАТУРА.**

У восьмым корпусе прапісаліся структурныя падраздзяленні Інстытута перападрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі, навукова-даследчая частка, факультэт інавацыйнай бесперапыннай адукацыі і студэнцкі бізнес-інкубатар.

Новы корпус у многім унікальны. У будынку размешчаны не толькі лекцыйныя залы, вучэбныя лабараторыі і камп'ютарныя класы. Маюцца таксама цэнтр відэа-канферэнц-сувязі і анлайн-заняткаў для слухачоў факультэта інавацыйнай і бесперапыннай адукацыі, якія навучаюцца дыстанцыйна. Тут жа будзе арганізавана сеткавае навучанне для прадстаўнікоў іншых універсітэтаў. На плошчы ў тры тысячы квадратных метраў створана безбар'ернае асяроддзе.

### Смартфон для жывёлавода

Цэлы паверх у новым корпусе аддадзены пад студэнцкі бізнес-інкубатар, дзе маладыя людзі — аўтары цікавых ідэй — змогуць атрымаць дапамогу ў рэалізацыі сваіх задум, іх ператварэнні ў бізнес і выхадзе на рынак. Для крэатыўнай моладзі тут створана 10 пляцовак, абсталяваных мэбляй і аргтэхнікай для работы камандаў. Ужо зараз у бізнес-інкубатары «прапісаліся» шэсць рэальных праектаў, якія прайшлі конкурсны адбор, кожны з іх курыруе ментар — супрацоўнік БДУІР, спецыяліст з Парка высокіх тэхналогій ці вучоны з Нацыянальнай акадэміі навук.

***(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)***

Увага, конкурс!

# ЮНКАРЫ, НА СТАРТ!




## «Чырвонка. Чырвоная змена» абвяшчае аб пачатку чарговага творчага спаборніцтва

**Традыцыйна ў пачатку новага навучальнага года ўжо каторы год запар «ЧЗ» дае старт конкурсу сярод юных і маладых няштатных аўтараў. Ён выступае ў якасці своеасаблівай пляцоўкі для самавыяўлення: дае творцам магчымасць расказаць пра сваю пазіцыю, пра стаўленне равеснікаў да тых ці іншых праблем грамадства, у тым ліку найперш — да сферы маладзёжнай палітыкі, расказаць пра іх асабісты ўклад у тую ці іншую справу. Пагадзіцеся, цяжка больш ёмка абазначыць словамі тое, да чаго ў выніку імкнецца «Чырвонка. Чырвоная змена» і чаго маладзёжны дадатак чакае ад удзельнікаў конкурсу.**

Яго назва — «Я — малады. І мне не ўсё роўна!» — стала адным з нашых найлепшых і даўгавечных трэндаў сярод іншых пастаянных рубрык. А ў пэўнай ступені конкурс стаў яшчэ і «кузняй» кадраў для журфака, а пасля і для самога маладзёжнага дадатку «Чырвонка. Чырвоная змена», і для іншых рэдакцый. Тыя, хто некалі першымі прынялі ўдзел у творчым спаборніцтве, цяпер — ужо маладыя спецыялісты, якія атрымалі першае працоўнае месца ў жыцці!

***(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)***



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Пераможцы нашага апошняга творчага конкурсу. Злева направа: Ангеліна Новікава паступіла на факультэт культуралогіі і сацыяльна-культурнай дзейнасці Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры, Валянціна Трубач стала першакурсніцай Інстытута журналістыкі БДУ, абраўшы спецыяльнасць «аўдыявізуальныя СМІ», у цяперашняй адзінаццацікласніцы Ірыны Бубновай, не сумняваемся, паспяховае паступленне яшчэ наперадзе.

# ІНІЦЫЯТЫВАМ — ЗЯЛЁНАЕ СВЯТЛО...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

**Магістранты кафедры ЭВМ БДУІР Мікалай ЛЯШКЕВІЧ і Сяргей КРАЎЦОЎ** працуюць над праграмна-апаратным комплексам бескантактнага трохмернага скаміравання сельскагаспадарчых жывёл. Праграма складаецца з двух узаемазвязаных модуляў: модуля пабудовы 3D-мадэляў жывёл на базе мабільных устройстваў і модуля разліку характарыстык сельскагаспадарчых жывёл на падставе трохмерных мадэляў.

**«Распазнанне твару ў Mimica павінна адбывацца на смартфоне, а не на серверы».**

— Мы цікавіліся, ці існуюць аналагі нашаму комплексу ў свеце, і высветлілася, што на бягучы момант нешта падобнае стварылі немцы, але толькі для «малагабарытных» жывёл і на падставе двухмернай выявы, — расказвае **навуковы кіраўнік праекта, загадчык кафедры ЭВМ БДУІР Дзмітрый САМАЛЬ**. — Наша задача — больш сур'ёзная. Мы будуем трохмерную мадэль жывёл: з дапамогай дальнамера з інфрачырвоным выпраменьваннем ствараецца воблака кропак, на іх падставе — трохмерная мадэль і ўжо пасля апрацоўкі атрыманых біяметрычных параметраў жывёлы (аб'ёму і плошчы шкуры), падлічваем яе масу без узважвання.

— Жывёлаводы, што рабілі заказ, распрацавалі формы, якія дазваляюць аб'ём і плошчу шкуры перавесці ў масу жывёліны, — удакладняе Сяргей Краўцоў. — Апаратны комплекс у нас ужо ёсць, зараз вучымся будаваць мадэлі і працуем над мабільнай праграмай для планшэта ці смартфона.

На пытанне «А ці не прасцей жывёліну проста ўзважыць?» хлопцы цярпліва тлумачаць: «Не прасцей!» Уявіце, колькі намаганняў патрабуецца, каб узважыць увесь статак: для гэтага трэба кожную жывёліну аддзяліць ад іншых і загнаць у загон на вагі. А калі жывёла хварэе, то ўзважваць яе трэба часцей. Спосаб бескантактнага ўзважвання, над якім працуюць магістранты БДУІР, не толькі зэканоміць час, але і пазбавіць жывёл ад непатрэбнага стрэсу. Іх распрацоўкай ужо зацікавіліся гаспадаркі, у прыватнасці СВК «Прагрэс-Верцялішкі» Гродзенскай вобласці.

## Гімнастыка для твару

Над стварэннем комплекснай сістэмы генерацыі плазмы атмасфернага разраду для нанаразмернай ачысткі і мадыфікацыі паверхні матэрыялаў рознай прыроды працуюць пяць чалавек: **студэнты чацвёртага курса факультэта радыёэлектронікі БДУІР Аляксандр АКСЮЧЫЦ, Мікіта ЛЕАНОВІЧ і магістранты кафедры мікра- і нанаэлектронікі Сяргей Нікіцюк і Андрэй Занько.**

— Плазма атмасфернага разраду, якую мы будзем распрацоўваць, — нізкатэмпературная (30—40 градусаў), гэта значыць, што яе можна прымяняць не толькі для мікра-, нанаэлектронікі і нанатэхналогій, але таксама ў медыцыне, біялогіі, сельскай гаспадарцы, авіяцыі, стаматалогіі, касметалогіі, для лячэння скурных захворванняў, у тым ліку раку скуры і меланомы, — тлумачыць **навуковы кіраўнік праекта, дацэнт кафедры мікра- і нанаэлектронікі, кандыдат тэхнічных навук Дзмітрый КОТАЎ.** — На першым этапе мы ствараем кампактную сістэму, а ў далейшым будзем яе адаптаваць пад практычнае прымяненне. Плазменныя тэхналогіі сёння шырока прымяняюцца на Захадзе, іх актыўна ўкараняюць немцы, японцы, карэйцы, а мы ў гэтым плане пакуль адстаём. Чэхі, напрыклад, адаптавалі іх для касметалогіі, але гэта вельмі дарагія камерцыйныя распрацоўкі. Важна, што навукаёмістасць нашай распрацоўкі — вялікая, а матэрыялаёмістасць — нязначная. За кітайцамі з іх рэсурсамі мы ніколі не ўгонімся, а вось стварыць штосьці навукаёмістае — цалкам у нашых сілах.

**Другакурснікі факультэта камп'ютарных сістэм і сетак БДУІР Глеб ЛІННІК, Ян ХАМУТОЎСКІ, Наталля ШТАНЮК і аспірант кафедры пластычнай хірургіі і камбустыялогіі БелМАПА Халід РУСТАМАЎ** распрацоўваюць мабільны трэнажор для навучання людзей мімічнай гімнастыцы. Каманда Mimica сфарміравалася на навуковым хакатоне некалькі месяцаў таму. Да аўтара ідэі ўрача-хірурга Халіда Рустамава далучыліся IOS-распрацоўшчыкі і прадукт-менеджар.

— Галоўная наша мэта — дапамагчы людзям з паралічам твару пасля аператыўных умяшанняў або з наступствамі запалення твару нерва, калі мышцы трэба навучаць рухацца наноў, — тлумачыць Халід.— Прадукт, над якім працуе наша каманда, з дапамогай алгарытмаў камп'ютарнага зроку і франтальнай камеры смартфона будзе распазнаваць здаровыя ўчасткі твару і паралізаваныя. А элементы дапоўненай рэальнасці (аніміраваныя падказкі, стрэлкі, прывязаныя да пэўных кропак) будуць падказваць пацыенту, якія практыкаванні і для якой часткі твару яму выконваць, што і як трэба зрабіць, каб усе мышцы зноў уключыліся ў работу.



Халід Рустамаў: «Галоўная мэта мабільнага трэнажора — дапамагчы людзям аднавіць міміку твару».

Карыстальнікаў у Mimica будзе некалькі: тыя, хто даведаўся аб мабільнай праграме ад урача, тыя, хто прайшоў аператыўнае ўмяшанне, і тыя, хто проста хоча палепшыць сваю знешнасць, напрыклад, папрацаваць над сваёй мімікай змогуць і артысты. Для кожнай групы будуць асобныя профілі карыстальнікаў са сваімі відэаўрокамі і праграмамі рэабілітацыі. Фатаграфіі пацыентаў да пачатку і пасля праходжання курсу хутчэй за ўсё будуць аналізаваць нейронныя сеткі. Па словах аўтара праекта, распазнанне твару ў Mimica павінна адбывацца на смартфоне, а не на серверы — у тым уся складанасць рэалізацыі ідэі.



Фота Надзеі БУЖАН.

Плазму атмасфернага разраду можна прымяняць у медыцыне, біялогіі, сельскай гаспадарцы, авіяцыі, стаматалогіі, касметалогіі...

## Маладыя і амбіцыйныя

Між іншым, самым маладым стартаперам бізнес-інкубатара БДУІР яшчэ не споўнілася і 18 гадоў. **Яўген БОГІНАЎ, Павел ЛАБАНОК і Дзмітрый ХАМЕЛЬЯНСКІ вучацца на другім курсе Мінскага радыётэхнічнага каледжа БДУІР** і працуюць над стварэннем вэб-праграмы, якая забяспечыць максімальна хуткі і зручны пошук сэрвіснага цэнтра для любой тэхнікі.

— Магчыма, для мінчан праблема з пошукам сэрвіснага цэнтра — не такая вострая, як для жыхароў невялікіх населеных пунктаў, хоць і тут можна сутыкнуцца з рознай якасцю паслуг, — кажа **навуковы кіраўнік праекта, намеснік дырэктара па вытворчым навучанні Мінскага каледжа радыёэлектронікі Кацярына КРЫШТОПАВА.** — А што рабіць, скажам, жыхару аграгарадка, да каго звяртацца? Везці свой халадзільнік ці тэлевізар у сталіцу ці ў абласны цэнтр? А, можа, у суседнім населеным пункце ёсць майстар, які яму дапаможа? На партале можна будзе пакінуць заяўку і атрымаць паслугу, спадзяёмся, што якасную паслугу.

Стартаперы кажуць, што ў інтэрнэце хапае каталогаў, дзе згадваюцца толькі тэлефоны і адрасы сэрвісных цэнтраў, але па згаданых нумарах можна званіць не адзін дзень. Платформа са зваротнай сувяззю, якую яны ствараюць, стане фактычна трэцім давераным бокам паміж кліентам і сэрвісным цэнтрам. Тут будуць прадстаўлены апошнія навіны, асвятляцца актуальныя тэмы. Можна будзе пакінуць водгук на якасць паслуг, прычым усе водгукі будуць не заказныя, а цалкам праўдзівыя, паколькі іх ніхто рэдагаваць не будзе.

— Мы ўпэўнены, што стартап, — які аб'яднаў нашых навучэнцаў, гэта цудоўны практычны досвед, — падкрэслівае Кацярына Крыштопава. — Тут трэніруюцца і ўменне працаваць у камандзе, і самаарганізацыя, выхоўваюцца арганізатарскія здольнасці. Яны вучацца не толькі ствараць прадукт, але і выводзіць яго на рынак, арганізоўваць уласную справу. Нават самая найлепшая навучальная праграма ніколі гэтага не заменіць.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

# ЮНКАРЫ, НА СТАРТ!

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

Застаюцца без змен і ўмовы правядзення творчага конкурсу, «адшліфаваныя» на працягу некалькіх гадоў. Нагадваем: вялікая просьба да будучых юных і маладых аўтараў і іх куратараў — уважліва азнаёмцеся з абавязковымі ўмовамі, якім павінны адпавядаць дасланыя работы.

Конкурс, як і папярэднія, разлічаны найперш на беларускамоўную моладзь, якая збіраецца паспрабаваць свае сілы ў журналістыцы, каб у далейшым, магчыма, звязаць сваё жыццё з гэтай прафесіяй. Нагадаем, што яго творчая планка даволі высокая, каб малады чалавек, які збіраецца прысвяціць сваё жыццё гэтай цікавай, але нялёгкай сферы, змог пакаштаваць «журналісцкага хлеба» і цвяроза ацаніць свае здольнасці.

Зноў жа традыцыйная просьба: не пішыце матэрыялы агульнымі словамі, не разважайце пра ўсім вядомае. Раскажыце — цікава! — пра канкрэтную падзею, мерапрыемства, якое арганізавала моладзь, каб выказаць сваю неабыякавасць да той ці іншай праблемы ці сітуацыі. Знайдзіце маладых людзей, якія сваімі справамі паказваюць такі прыклад. На выхадзе павінен атрымацца цікавы матэрыял, яркая публікацыя, «улётны» рэпартаж, але ніяк не «тэкст», як чамусьці любіць гаварыць цяперашняя моладзь!

І яшчэ адна парада. Калі вы цікавіцеся журналістыкай, запішыцеся ў адпаведны гурток у школе ці доме творчасці. Як паказвае практыка, найлепшыя поспехі на ніве творчасці — найперш у тых пачатКоўцаў, хто ўжо хоць бы трохі «падкаваны» і тэарэтычна, і практычна. Яшчэ юным і маладым творцам раім пачытаць нашы парады, якія пад рубрыкай «Хачу на журфак!» змяшчаліся сёлета ў «Чырвонцы. Чырвонай змене» 16 лютага, 2 і 23 сакавіка, 6 і 20 красавіка, а таксама 4 мая.

Па выніках конкурсу пераможцы атрымаюць памятныя прызы. Тым з іх, хто налета збіраецца паступаць на факультэт журналістыкі, рэдакцыя дасць яшчэ і рэкамендацыі. Конкурс будзе доўжыцца да 1 мая (дата адпраўкі матэрыялаў). Найлепшыя творчыя работы (у залежнасці ад колькасці, якая паступіць) «Чырвонка. Чырвоная змена» можа працягваць друкаваць і надалей. **Вынікі плануецца падвесці ДА ПАЧАТКУ ЎСТУПНАЙ КАМПАНІІ.**

Матэрыялы на конкурс можна дасылаць на электронны адрас konkurschz@mail.ru або на паштовы (Рэдакцыя газеты «Звязда», вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, 220013, г. Мінск) з абавязковай паметкай «Я — малады. І мне не ўсё роўна!»

### Абавязковыя ўмовы, якім павінны адпавядаць конкурсныя работы:

**1.** «Проба пяра» павінна быць ТОЛЬКІ НА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ.

**2.** Тэксты дасылаюцца ў фармаце RTF (калі па пошце, дык у раздрукаваным выглядзе, а фотаздымкі — на дыску).

**3.** Кожная ілюстрацыя ці фотаздымак да тэксту дасылаецца АСОБНЫМ прымацаваным файлам.

**4.** Аб'ём конкурсных работ — не больш за 8 тысяч знакаў (з прабеламі).

**5.** Колькасць «проб пяра» ад аднаго аўтара не абмежавана, аднак пры вялікай колькасці конкурсных работ кожнаму ўдзельніку (пры ўмове належнай якасці матэрыялаў і адпаведнасці ўмовам конкурсу) даецца па адным шанцы. Астатнія яго матэрыялы будуць надрукаваны (зноў жа пры ўмове належнай іх якасці) як звычайныя журналісцкія — па-за конкурсам.

**6.** Узрост удзельнікаў таксама не абмежаваны, але найперш конкурс разлічаны на навучэнцаў старшых класаў.

**7.** Жанр «проб пяра» — любы, але гэта павінна быць толькі проза (нататка, рэпартаж, эсэ, замалёўка, інтэрв'ю).

**8.** Пажадана, каб матэрыял быў напісаны спецыяльна для конкурсу. Вялікая просьба не дасылаць школьных сачыненняў, рэфератаў (і па форме, і па змесце), асабліва падрыхтаваных пэўны час таму. У пачатку тэксту павінен быць загаловак (назва конкурсу не з'яўляецца такім), напрыканцы — імя і прозвішча аўтара.

**9.** Аўтар абавязаны пазначыць свае пашпартныя звесткі (нумар і серыя, ідэнтыфікацыйны нумар, кім і калі быў выдадзены дакумент, імя, імя па бацьку, прозвішча) і дамашні паштовы адрас (індэкс, населены пункт, вуліца, дом). Гэтыя звесткі будуць патрэбны для бухгалтэрыі ў выпадку, калі «проба пяра» будзе надрукавана ў газеце. ТОЛЬКІ яны падаюцца аўтарам на БЕЛАРУСКАЙ і РУСКАЙ мовах. У выпадку, калі ў маладога ці юнага аўтара яшчэ няма пашпарта, вышэйназваныя звесткі падаюцца на аднаго з бацькоў, настаўніцу, кіраўніка гуртка (звесткі з пасведчання аб нараджэнні для бухгалтэрыі не падыходзяць).

**10.** Апроч таго, аўтар паведамляе СВОЙ нумар мабільнага або дамашняга тэлефона, каб рэдакцыя ў выпадку неабходнасці магла аператыўна з ім звязацца.

**11.** Павінна быць пазначана поўная колькасць гадоў аўтара на момант адсылання конкурснай работы, нумар школы і класа.

**12.** Аўтар павінен паведаміць крыху даткавай інфармацыі пра сябе (10—15 радкоў) у адвольнай форме. Напрыклад, якія і ў чым мае дасягненні (вучоба, спорт, мастацтва і г. д.), чым захапляецца ў вольны час, кім марыць стаць у будучыні і інш.

**13.** Калі дасланыя матэрыялы не падыходзяць да друку, яны не рэцэнзуюцца.

**14.** Пра канчатковую дату падвядзення вынікаў творчага конкурсу рэдакцыя паведаміць дадаткова. Адсочваць публікацыю «проб пяра» павінны самі юныя і маладыя аўтары або іх куратары (бацькі, настаўнікі, кіраўнікі гурткоў).

* * *

Ну што ж, напрыканцы наша заўсёднае: «вастрыце пёры», аўтары! Зычым усім творчых поспехаў і перамог! Як мы не стамляемся паўтараць, паверце, прайграўшых у конкурсе не будзе!

**Куратары праекта**
**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*
**і Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

Трэці працоўны

# У ПІЦЕРЫ — БУДАВАЦЬ

## Беларускія студэнты дапамагалі ўзводзіць у горадзе на Няве школу танцаў

**Летам студэнцкія атрады традыцыйна працуюць на аб'ектах па ўсёй Беларусі. І не толькі. Напрыклад, будатрад імя Героя Савецкага Саюза Васіля Мічурына шчыраваў у Пецярбургу — дапамагаў узводзіць школу і вучэбны тэатр для Акадэміі танца Барыса Эйфмана.**

Трапіць у шэрагі байцоў было не так і проста. Прыйшло шмат заявак: на месца ў атрадзе прэтэндавалі два—тры чалавекі. Пры адборы ў асноўным цаніўся вопыт — каб маладыя людзі годна прадставілі нашу краіну.

**Студэнт чацвёртага курса БДУІРа Дзмітрый КУНІЧНІКАЎ,** які вучыцца на інжынера медыцынскай электронікі, у атрадах, напрыклад, быў ужо ў трэці раз. Дагэтуль ездзіў збіраць яблыкі і будаваць атамную электрастанцыю ў Астраўцы. У піцерскай камандзе яго назначылі камісарам. «Мы былі падсобнымі рабочымі, — расказвае Дзмітрый. — Займаліся мантажом рыштаванняў, прыбіралі будаўнічае смецце, дапамагалі сантэхнікам устанаўліваць радыятары, электрыкам — пракладваць праводку. Такое ўсім пад сілу. Некаторыя кажуць: «На будоўлі працаваць непрэстыжна». І не працуюць нідзе. А я лічу, што для студэнта на лета гэта нядрэнная работа, якая да таго ж дазваляе адпачыць ад вучобы».

Працоўны дзень у хлопцаў цягнуўся з 9 да 18 гадзін. Жылі яны ў хостэле на Васільеўскім востраве. А харчаваліся ў сталоўцы «Ленфільма»: акрамя рэгулярных сняданкаў, абедаў і вячэраў (па словах байцоў, кармілі іх выдатна), быў і яшчэ бонус — экскурсія па найстарэйшай у Расіі кінастудыі. Студэнты ўбачылі касцюмы, у якіх з'яўляліся на экране героі фільмаў «Чалавек-амфібія», «Шэрлак Холмс», пабывалі ў здымачным павільёне.

Культурная праграма ўвогуле выдалася насычаная: Пецяргоф, Кранштат, Марыінскі тэатр... Кожныя выхадныя былі распісаны.

— Вельмі спадабаліся Эрмітаж і Царскае сяло. А яшчэ мы пабывалі з хлопцамі на Дні ваенна-марскога флоту — свята скончылася фантастычным салютам, — дзеліцца ўражаннямі **трэццякурснік БДУІРа Арцём ЛАЙША.**

Хлопец вывучае ва ўніверсітэце інфармацыйныя сістэмы і тэхналогіі ў лагістыцы. У студатрадах ён не навічок: мінулым разам ездзіў на будоўлю БелАЭС. А вось для **трэццякурсніка БНТУ Паўла СЫСЫ** (спецыяльнасць «пад'ёмна-транспартныя, будаўнічыя дарожныя машыны і абсталяванне») гэта быў першы падобны вопыт. «Шмат чуў аб дзейнасці студатрадаў і вырашыў таксама да іх далучыцца. Да таго ж гэта была яшчэ магчымасць падарожнічаць — я, напрыклад, у Піцеры раней не быў, але вельмі хацелася».



Культурная праграма ў студэнтаў выдалася насычанай.

Заробак, які атрымалі байцы, складае каля 650 рублёў у месяц, калі пераліччыць на беларускія грошы. Для студэнта зусім нядрэнна! Цікавімся, на што патрацілі заробленае.

— Ужо нічога не засталося, — смяецца Дзмітрый. — За вучобу заплаціў.

— А я падарыў бацькам на гадавіну вяселля шчаня бігля, — дзеліцца Арцём.

Аб тым, што летам прыйшлося шчыраваць, а не адпачываць на канапе, хлопцы не шкадуюць. Столькі знаёмых і сяброў завялі дзякуючы студатраду! А галоўнае, працуючы поруч з майстрамі, атрымалі каштоўны вопыт, які дазволіць больш упэўнена адчуваць сябе пры далейшым уладкаванні на работу.

«Тут вучышся працаваць у калектыве, развіваеш лідарскія якасці і становішся больш дарослым, — лічыць Ацём. — Будатрад навучыў, што трэба цаніць любую працу».

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*

З базай у галаве

# Ад «азоў» — да ўласнага мультфільма

## Больш за 300 праектаў стварылі беларускія школьнікі ў ІТ-лагеры

**ІТ-лагер — сумесны праект Міністэрства адукацыі і кампаніі МТС, які быў рэалізаваны ў жніўні. Яго партнёрам выступае Адукацыйны цэнтр Парка высокіх тэхналогій.**



У рамках праекта ў дзіцячым аздараўленчым лагеры «На ростанях» былі арганізаваныя курсы «Праграмаванне гульняў на мове Scratch». На занятках дзеці вучыліся ствараць уласныя анімаваныя і інтэрактыўныя гісторыі, прэзентацыі, мадэлі і гульні. Усяго для дзяцей ва ўзросце ад 7 да 14 гадоў было праведзена 16 урокаў. Школьнікі займаліся ў групах бясплатна, а напрыканцы навучання прадставілі журы ўласныя ІТ-праекты — мультфільмы і інтэрактыўныя гульні на мове Scratch.

З дзятвой працавалі супрацоўнікі Адукацыйнага цэнтра ПВТ, у якіх ёсць адпаведны досвед. У выніку ў летнім ІТ-лагеры дзеці пазнаёміліся з асновамі праграмавання, навучыліся працаваць у камандзе і аналітычна разважаць, паўтарылі школьную праграму па інфарматыцы, матэматыцы, фізіцы і нават літаратуры.

— Міністэрства адукацыі ўдзяляе асаблівую ўвагу лічбавай трансфармацыі галіны. Адна з найважнейшых задач, якую мы ставім сёння перад сабой, — навучыць дзяцей адаптавацца да дынамічнага развіцця тэхналогій, — пракаментаваў падзею **дырэктар Галоўнага інфармацыйна-аналітычнага цэнтра Міністэрства адукацыі Павел ЛІС.** — Праграма навучання ў лагеры была складзена такім чынам, каб вучні маглі раскрыць свой патэнцыял, ператвараць ідэі ў канкрэтныя праекты. А дапамаглі ім у гэтым вопытныя ІТ-спецыялісты.

— Мэта сумеснага праекта МТС і Міністэрства адукацыі — навучыць дзяцей выкарыстоўваць сучасныя тэхналогіі кваліфікавана і з карысцю, бо за гэтым будучыня. У ІТ-лагеры школьнікі не толькі атрымалі ўяўленне аб праграмаванні, але і навучыліся рашаць нестандартныя лагічныя задачы, атрымалі стымул развівацца далей. ІТ-лагер — гэта пілотны праект, які мы плануем працягваць, — дадала **кіраўнік праекта Надзея БАС.**

Дарэчы, сёлета адзначаецца 10-годдзе стварэння Scratch. Да юбілею быў прымеркаваны шэраг міжнародных канферэнцый, якія прайшлі ў Францыі, Коста-Рыцы, Чылі, Бразіліі, Кітаі і Венгрыі.

Прафесар Мітчэл Рэзнік, кіраўнік даследчай групы Lifelong Kindergarten Масачусецкага тэхналагічнага інстытута, на міжнароднай канферэнцыі Scratch Conference 2017 у Будапешце высока ацаніў працу беларускіх настаўнікаў.

«...Я з захапленнем даведаўся пра тое, як вы выкарыстоўваеце Scratch у Беларусі. Дзякуй вам за дапамогу ў навучанні школьнікаў крэатыўным магчымасцям праграмавання ў асяроддзі Scratch», — выказаў Мітчэл Рэзнік словы падзякі беларускім педагогам.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

І адпачыць, і зарабіць

# ПРАПАЛОЦЬ ЕЛКІ? ЗМОЖА І ПАДЛЕТАК!

**Мінула лета... Падчас канікул падлеткі імкнуліся цікава і з карысцю адпачыць, каб вярнуцца на вучобу з новымі сіламі. Хтосьці ездзіў з бацькамі за мяжу, нехта забаўляўся дома, а некаторыя вырашылі падзарабіць на кішэнныя выдаткі.**



...У лесагадавальніку на ўскрайку Чэрвеня чакалі «пяшчотнай» прапалкі елачкі, якія ледзь дараслі да дзесяці сантыметраў. Клапаціцца пра маленькіх лясных «жыхароў» даручылі руплівым падлеткам.

— Сёлета мы запрасілі школьнікаў на прапалку пасля доўгага перапынку, — расказвае **начальнік лесагадавальніка Таццяна МАРОЗ.** — У нас працавалі падлеткі, пераважна ад чатырнаццаці да шаснаццаці гадоў. Хоць прыходзілі таксама і студэнты. Хтосьці даведваўся пра магчымасць падзарабіць праз абвестку БРСМ, хтосьці — праз «сарафаннае радыё». На работу чамусьці хадзіла больш хлопцаў. Па шчырасці я сумнявалася: «Няўжо будуць палоць?!» Але вырашыла: няхай паспрабуюць. Аказалася, працуюць яны лепш за дзяўчат!

***— А кагосьці з дзяўчынак можаце адзначыць?***

— Была такая! Яна ва ўсіх гарадскіх святах удзельнічае. Спявае, танцуе. Мабыць, без яе не абыходзіцца ні адно мерапрыемства. Я спачатку здзівілася: «Даша, і ты тут?». Яна прыходзіла штодня больш за месяц. Выконвала сваю работу як мае быць. І зарабіла, дарэчы, больш за ўсіх.

***— А колькі маглі зарабіць падлеткі?***

— Мы плацім ім па агульных расцэнках, як і пастаянным работнікам. Але не за гадзіну, а за пэўную колькасць зробленага. Каб атрымаць прыкладна 10 рублёў, трэба прапалоць адну сотку — метр на сто метраў. Калі дарослы гэтую норму выконвае, то дзецям мы даём толькі палову, мінус пятнаццаць працэнтаў. Атрымліваецца 0,4 соткі. Хоць насамрэч яны спраўляюцца і з большымі аб'ёмамі.

У сярэднім у падлеткаў выходзіла прыкладна па 120 рублёў. Самы вялікі заробак — 350 рублёў — атрымалі толькі трое. Яны хадзілі кожны дзень на працягу месяца. Так зможа не кожны, бо праца ўсё ж цяжкая.

***— А самыя складаныя ўмовы, пры якіх даводзілася працаваць? Гарачыня?***

— Так, але калі было больш за трыццаць градусаў, я ім не дазваляла выходзіць на поле ўвогуле. З васьмі раніцы да апоўдня можна было і сонечны ўдар атрымаць. Хто хацеў, прыходзіў а шостай раніцы. А хто не мог прачнуцца — увечары, а пятай: у нас спецыфічная праца, таму графік дазваляе.

***— А калі дождж?..***

— Тады ў нас выхадны! Калі ён моцны... А калі дробненькі — наадварот, добра. Прахалода, ніякіх насякомых...

...А восьмай раніцы, пахмурнае неба, збіраецца на дождж. Але на гадавальніку ўжо шчыруюць тры дзяўчынкі і два хлопчыкі.

Знаёмімся: Максім Сячны, Даніла Альховік, Ганна Касцевіч, сястрычкі Марына і Ліза Смяцкія. Першым чацвярым — па пятнаццаць гадоў, вучацца ў школе. А мініяцюрнай Лізе — дваццаць, яна студэнтка педагагічнага ўніверсітэта. Аднак мэта аказалася ва ўсіх адна — зарабіць грошай, каб не напружваць бацькоў. Максіму, напрыклад, яны патрэбныя, каб пайсці вучыцца ў аўташколу. Марына займаецца ў мастацкай школе і плануе набыць для сябе добрыя фарбы. Ліза зарабляе на студэнцкае жыццё і модные адзенне. А вось Ганна і Даніла не задумваліся пра грошы, проста не хацелі марнаваць свой вольны час... Усе працуюць з сур'ёзнымі тварамі, рэдка перамаўляюцца. Дзяўчаты яшчэ і трэцяй часткі не прайшлі, а Максім ужо ў канцы свайго ўчастка! Кажа, што натрэніраваўся рабіць усё хутка.

Гледзячы на старанную працу дзяўчат і хлопцаў, прыгадала ўласны працоўны вопыт падчас школьных канікулаў. Здаецца, не так даўно сама выходзіла на поле. Калі вярталася дадому — клалася на канапу і не магла зварухнуцца. Але на наступны дзень уставала разам з сонцам, каб зноў убачыць сяброў-калег. Атрымаўшы грошы, адчула пэўную незалежнасць ад бацькоў...

Так і гэтыя падлеткі. Пазнаёміўшыся з імі бліжэй, зразумела, што ў іх — падобныя пачуцці. Зарабляючы свае першыя грошы, яны імкнуцца да самастойнасці...

**Юлія АДАМОВІЧ,**
**студэнтка ІІІ курса Інстытута журналістыкі БДУ.**

Свая гульня

## «Першая зборная» стала найлепшай

**Уладальнікам Кубка Еўропы па інтэлектуальных гульнях сярод студэнцкіх камандаў стала расійская «Першая зборная» (г. Масква). Па выніках выступленняў яна набрала 62 балы.**

Нагадаем, што на працягу трох дзён у Беларускім дзяржаўным універсітэце праходзіў інтэлектуальны марафон, які сабраў 32 зборныя з Беларусі, Расіі, Украіны, Арменіі, Азербайджана і Латвіі — пераможцаў і прызёраў нацыянальных адборачных тураў. Беларусь прадстаўлялі 9 камандаў. У іх склад увайшлі студэнты Белдзяржуніверсітэта, БДУІР, Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта, Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта, БДПУ, Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П. М. Машэрава, Віцебскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта, а таксама навучэнцы Ліцэя БДУ.

Каманды змагаліся за перамогу ў спартыўных версіях тэлевізійных гульняў «Што? Дзе? Калі?», «Брэйн-рынг», «Эрудыт-квартэт», а таксама ў індывідуальнай «Сваёй гульні». Уладальнік кубка Еўропы вызначаўся па выніках выступлення ў камандных гульнях.

Другой у інтэлектуальнай гонцы стала мінская каманда «Вельмі змяніліся за лета» з 38 баламі. А замкнула тройку лідараў яшчэ адна сталічная каманда «Корпрусарыум deluxe», якая набрала 32,75 бала.

Лепшай у гульні «Што? Дзе? Калі?» стала чэмпіён цяперашняга сезона «Першая зборная». У «Брэйн-рынгу» перамаглі студэнты з «Рыбалюдзі» (г. Кіеў). «Эрудыт-квартэт» скарыўся «Корпрусарыум deluxe». У індывідуальнай «Сваёй гульні» найлепшым знатаком прызнаны ігрок з «Першай зборнай» Міхаіл Навасёлаў.

Адзначым, што БДУ стаў першай айчыннай ВНУ, дзе быў разыграны Кубак Еўропы па інтэлектуальных гульнях. Традыцыйным месцам іх правядзення з'яўляўся Санкт-Пецярбургскі дзяржаўны ўніверсітэт. Толькі апошнія два гады фінал чэмпіянату быў арганізаваны ў Віцебску.

Для даведкі: Кубак Еўропы сярод студэнцкіх камандаў праводзіцца, пачынаючы з 2005 года. У турніры могуць выступаць гульцы, узрост якіх не перавышае 24 гады. Ініцыятарамі і першымі арганізатарамі Кубка былі Дабрачынны фонд развіцця студэнцкіх ініцыятыў «Гаўдэамус», Санкт-Пецярбургскі дзяржаўны ўніверсітэт, Міжрэгіянальная грамадская арганізацыя інтэлектуальна-творчых гульняў і Пецярбургскі клуб інтэлектуальных гульняў «Самсон».

Арганізатарамі Кубка-2017 выступілі БДУ, Міжнародная асацыяцыя клубаў «Што? Дзе? Калі?» і Беларуская ліга інтэлектуальных камандаў.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

Экстрэмальны занятак

# ЗОНЫ ПРЫЦЯЖЭННЯ

## Чым яны вабяць сталкераў?

**Сталкерам называюць чалавека, які наведвае і даследуе закінутыя месцы. Упершыню гэта слова было выкарыстана Аркадзем і Барысам Стругацкімі ў 1972 годзе ў аповесці «Пікнік на абочыне» і папулярызавана ў фільме Андрэя Таркоўскага «Сталкер». Цікавасць да такіх месцаў, асабліва сярод моладзі, актывізавалася пасля аварыі на ЧАЭС. Пра тое, што даюць чалавеку гэтыя падарожжы, са свайго вопыту расказаў знаўца закінутых месцаў Пётр Філон.**

Хлопец вырас у Гомелі. З наступствамі аварыі на ЧАЭС знаёмы з дзяцінства — быў адным з першых удзельнікаў праграмы «Дзеці Чарнобыля», у рамках якой некалькі гадоў ездзіў у Італію на летніх канікулах.

Па адукацыі Пётр — фізік, спецыялізуецца ў оптыцы. Падчас навучання ў магістратуры ён працаваў у Беларускім дзяржаўным універсітэце транспарту, дзе, на яго погляд, была адна з найлепшых у краіне навучальных лабараторый радыяцыйнай бяспекі. Там і захапіўся гэтай тэмай. Цяпер наш герой — экскурсавод па дзяўніцтва новага канфайнмента, — расказвае Пётр.

У Беларусі ён наведваў закінутыя месцы толькі ў Гомельскай і Магілёўскай абласцях. Падарожнічае хлопец у асноўным на аўтамабілі — так дабрацца і прасцей, і хутчэй. Звычайна вылазка займае ўсяго адзін дзень.

### ■ Будзь у курсе!

Экскурсіі праходзяць па праграме, падпісанай кіраўніком зоны і рэжымным аддзелам, і строга ў адпаведнасці з ёй. Менавіта турызм у зоне забаронены. Туры называюцца «наведваннем грунпай грамадскасці з азнаямленчай мэтай», яны не патрабуюць дамоваў.

На кожнай экскурсіі прысутнічае супрацоўнік зоны адчужэння, які суправаджае групу.

Ёсць дазвол на кожнага ўдзельніка, а таксама пропуск на транспарт.

Мяжа перасякаецца ў пунктах пропуску афіцыйна, са штампамі, мытняй і пашпартным кантролем.



Загарызонтная радыёлакацыйная станцыя «Дуга».

зоне адчужэння, дарэчы, універсітэцкія веды яму вельмі спатрэбіліся.

— Калі я служыў у арміі, наша часць размяшчалася ў былой лакацыі ракетных войскаў СССР. Вакол было вельмі шмат закінутых ангараў і бункераў. Тады ў мяне і з'явіўся запал да даследавання закінутых аб'ектаў. Калі атрымлівалася палазіць па тых бункерах, гэта было для мяне адначасова і адпачынкам, і захапленнем. Часта я сам напрошваўся на збор грыбоў для афіцэрскай сталовай, каб там пагуляць. Гэта былі першыя закінутыя месцы, якія я наведаў. Шкада толькі, што не было добрага фотаапарата, — успамінае хлопец.

У 2013 годзе Пётр Філонператварыў хобі ў работу — стаў арганізоўваць туры ва ўкраінскую зону адчужэння. Ён быў там ужо больш за 60 разоў, але, як прызнаецца, нават за свой пяты сезон даследаваў не ўсё.

— Застаў ЧАЭС яшчэ ў старым выглядзе, з трубой ВТ-2 і старым саркафагам. Затым быў сведкам бу-

— Маё любімае месца — сядзіба Герардаў у вёсцы Дзям'янкі — гэта зона адсялення ў Добрушскім раёне. Месца напоўнена гісторыяй і легендамі пра прывідаў. Кажуць, падчас Першай сусветнай вайны полк рускіх войскаў спыніўся ў маёнтку Герарда. Адзін з афіцэраў і дачка гаспадара Рыта закахаліся адно ў аднаго. Полк пайшоў на фронт, і Рыта збегла ўслед за каханым. Герард загадаў дагнаць яе. Пасля вяртання дзяўчына выйшла ў парк і застрэлілася з пісталета бацькі. Цяпер кажуць, яе прывід блукае па наваколлі.

Таксама Пятру запомніўся паход з сябрамі ў вайсковую часць каля вёскі Баршчоўка, таму што з-за яго наш герой спазніўся на ўласны дзень нараджэння — госці пачалі свята без яго.

— Мы вырашылі пакінуць машыну за 15 кіламетраў ад часці і прайсці да яе пешшу. З мабільнымі праграмамі заблукаць складана, але гэта быў пачатак вясны — мясцовасць забалочаная, прайсці нідзе нельга. Патрэбнае месца знайшлі толькі



Пётр у пятым недабудаваным энергаблоку ЧАЭС, з гайкай ад яго.

### Бліц

***— Што найперш узяць у дарогу сталкеру-пачаткоўцу?***

— Галоўнае, не забыцца на фотаапарат, каб потым асвяжыць у памяці ўражанні.

***— Самы папулярны сталкерскі сняданак?***

— «Мівіна» з тушонкай.

***— У колькі (па часе і фінансава) звычайна абыходзіцца падарожжа?***

— Усё залежыць ад маршруту. Мае асноўныя траты — на бензін, астатнія выдаткі можна назваць неістотнымі.

***— Дзе шукаць кампанію?***

— У тэматычных групах сацсетак, але і сярод сваіх знаёмых заўсёды можна знайсці тых, каму гэта будзе цікава.

***— Топ месцаў, якія трэба наведаць, каб лічыць сябе сапраўдным сталкерам?***

— Аб'ект Гомель-30, стары аэрапорт у Зябраўцы, бункер Гарбачова (сам не быў, але мару пабываць там), Палескі дзяржаўны радыяцыйна-экалагічны запаведнік і вёскі ў яго наваколлі. Цікавых месцаў — сотні, але абавязкова трэба паглядзець самую зону адчужэння.

праз пяць гадзін блуканняў, мокрыя і стомленыя, — расказвае Пётр.

Дарэчы, гэта далёка не адзінае экстрэмальнае падарожжа ў сталкерской біяграфіі героя.

— Ва ўкраінскай зоне праводзіў індывідуальны тур. Вёз хлопцаў з Брэста, у іх кампаніі была госця з Кентукі (ЗША). На адной з дарог зоны (якраз насупраць ЧАЭС), каля рудога лесу, мы прабілі на выбоінах паддон рухавіка. Рухацца далей — нельга, праграма — строга па часе, начаваць у Чарнобылі — таксама ніяк... Але Чарнобыль — маленькі горад, усе адзін аднаго ведаюць. Суправаджальнік знайшоў тых, хто змог адбуксіраваць нас за межы зоны. Адначасова даведаліся, ці ёсць патрэбная дэталь дзе-небудзь паблізу. Запчасткі не было, але знайшлі сэрвіс у Іванкаве, дзе маглі б узяцца за рамонт. Угаварылі ўсіх, хто нам дапамагаў, пачакаць, пакуль мы паглядзім (ужо пешшу) Прыпяць, бо з Кентукі кожны дзень туды не наездзішся! У Іванкаве, ужо пасля закрыцця, нас чакаў майстар у аўтасэрвісе — дзякуй Богу, сюрпрызы скончыліся.

Тое, што далёкія госці наведваюць зоны адсялення, Пятра не здзіўляе. Ён расказвае, што гэта даволі частая з'ява. Часам прыязджаюць цэлыя аўтобусы з кітайскімі або амерыканскімі групамі, шмат турыстаў з Польшчы і Японіі. У гэтых краінах нямала арганізатараў такіх паездак, а адкрыты нядаўна «бязвіз» ва Украіну прыцягнуў яшчэ больш цікаўных. На экскурсіі да Пятра прыязджалі турысты з Чыкага, Чэлябінска, Алматы, Тэль-Авіва, Мюнхена, Парыжа і іншых гарадоў. Паводле слоў сталкера, на іх за пяць гадоў пабываў таксама хоць бы адзін жыхар кожнага, нават самага маленькага беларускага гарадка.

Пытаем у героя, чаму суайчыннікі даволі актыўна цікавяцца наведваннем закінутых мясцін.

— У першую чаргу, гэта пазнавальны інтарэс. Рызыкі і экстрыму дадае тое, што патрэбныя мясціны трэба шукаць, часам блукаючы па лесе. У адрозненне ад культурнага турызму, на закінутых тэрыторыях не сустрэнеш соцень людзей. Выключэнне можа скласці толькі Прыпяць — перад накрыццём новага саркафага на ЧАЭС у Прыпяцкім парку было людзей больш, чым да аварыі.

— Пасля даволі экстрэмальных падарожжаў цікавасць да стандартных трыпаў не знікла? З'ездзіць на мора і г. д.?

— Да звычайнага турызму інтарэс таксама ёсць, па магчымасці імкнуся куды-небудзь ездзіць. Нядаўна быў, напрыклад у Піцеры.

**Дар'я СПЕВАК.**
*dashaspevak@gmail.com*

### Кампетэнтна

Сталкерам-пачаткоўцам неабходна памятаць, што незаконнае наведванне зоны адчужэння цягне за сабой наступствы. Як паведаміў **Канстанцін ШАЛЬКЕВІЧ, афіцыйны прадстаўнік МУС,** з пачатку 2017 года супрацоўнікамі АУС Гомельскай вобласці ў дачыненні да 120 чалавек былі складзеныя адміністрацыйныя пратаколы па арт. 16.3 КаАП Рэспублікі Беларусь за парушэнне патрабаванняў рэжыму радыяцыйнай бяспекі ў мясцовасцях, якія падвергліся радыеактыўнаму забруджванню. Згодна з другім пунктам гэтага артыкула, парушэнне патрабаванняў рэжыму радыяцыйнай бяспекі ў спецыяльна адмежаванай зоне радыеактыўнага забруджвання, якое праявілася ў пранікненні ў гэтую зону <...>, цягне накладанне штрафу ў памеры ад дзесяці да трыццаці базавых велічынь <...>. Дзеянне, учыненае паўторна на працягу года пасля накладання адміністрацыйнага спагнання, цягне спагнанне штрафу ад дваццаці да пяцідзесяці базавых велічынь.



У градзірні трэцяй чаргі ЧАЭС.

*Нечакана!*

# ДЗЯЎЧЫНА Ў ШЛЕМЕ... ХАКЕЙНАГА ГАЛКІПЕРА

**Думаеце, хакей — мужчынская гульня, а дзяўчатам застаецца толькі танцаваць у групе падтрымкі або хварэць за каманду на трыбунах? Тады знаёмцеся: мінчанка Юліі АБАСАВАЙ 29 гадоў, яна працуе ў сферы IT, апроч гэтага, мая суразмоўніца — варатар аматарскай каманды сталічнага хакейнага клуба «Саюз». Юлія не па чутках ведае: у гэтага віду спорту, без сумненняў, можа быць і жаночы твар!**




У клубе дзяўчына займаецца са снежня мінулага года. Гэта яе першая каманда, раней Юлія нідзе не гуляла. Дарэчы, у асноўным складзе ёсць яшчэ адна прадстаўніца жаночага полу, яна — нападаючы. Усе астатнія гульцы — хлопцы. Па словах хакеісткі, калі па-за гульнёй мужчыны і ўспрымаюць яе як дзяўчыну, то на лёдзе гэта не мае значэння. Юлія з задавальненнем падзялілася сваім жаночым пунктам гледжання на хакей.

***— Як даўно з'явілася цікавасць да гэтага віду спорту?***

— Колькі сябе памятаю, столькі люблю хакей. У нас на дачы былі старыя савецкія канькі вялізнага памеру. Калі была маленькай, абувала іх і хадзіла па хаце, уяўляла, быццам я на лёдзе. З дзяцінства марыла стаць менавіта варатарам. Зімой мы часта гулялі з сябрамі ў хакей, і ніхто чамусьці не хацеў станавіцца на вароты, а мяне пра гэта і прасіць не трэба было! Праўда, у якасці варотаў тады выкарыстоўвалі металічныя скрынкі ад малочных бутэлек.

***— Як ставяцца да захаплення сябры і блізкія?***

— Бацькі адзін раз схадзілі на гульню, пасля гэтага мама прызналася, што падчас матча ў яе ледзь сэрца не спынілася. Таму больш стараюся яе не запрашаць, бо яна вельмі за мяне хвалюецца. Тата таксама не разумее, навошта яго дачцэ хакей. Але блізкія людзі ўсё роўна ведаюць, што гэта важная частка майго жыцця. У іншых такое захапленне заўсёды выклікае здзіўленне.

***— Якімі якасцямі павінен валодаць хакеіст?***

— Самае галоўнае — гэта жаданне перамагчы самога сябе. Калі толькі пачынала гуляць у варотах, то пры кідку нападаючага заплюшчвала вочы. Так, гэта нармальная рэакцыя, але для варатара вельмі важна заўсёды бачыць момант кідка. Каб пераадолець свой страх, я кожны раз гучна сабе казала: «Глядзі на шайбу!» Самаўнушэнне і ўпартасць дапамаглі. Цяпер ужо нічога не баюся.

Кожны хакеіст павінен успрымаць каманду як адзіны арганізм. Важна разумець, што гол — гэта памылка ўсіх, а не канкрэтнага чалавека. Членам каманды не варта вінаваціць адзін аднаго ў няўдачах, бо гульня будуецца на ўзаемным даверы. Слабая, але з'яднаная каманда можа adолець нават больш моцнага саперніка.

***— Самы яркі ўспамін, звязаны з гульнёй?***

— Аднойчы мне выпала магчымасць пабываць на матчы каманд НХЛ «Нью-Ёрк Рэйнджэрс» і «Караліна Харыкейнз» у Нью-Ёрку. Білеты мне падарылі на дзень нараджэння. Я сядзела за варотамі «Караліны», ім тады забілі, калі не памыляюся, шэсць галоў. Гэта быў вопыт!

Канешне, прыгадваецца і мая першая гульня — таварыскі матч у Беразіне. Усё праходзіла зімой на адкрытай пляцоўцы, мароз быў амаль 20 градусаў. Сустрэлі нас вельмі ветліва, было шмат мясцовых балельшчыкаў. А самае галоўнае — ніхто не паверыў, што на варотах стаяла дзяўчына! Для мяне гэты дзень стаў сапраўдным святам!

***— Чаму найперш навучыў хакей?***

— На гэтае пытанне я б адказала англійскім словам «overcome», што перакладаецца як «пераадолець». Бывалі моманты, калі хацелася ўсё кінуць: настолькі нічога не атрымлівалася, што здавалася, «хакейныя багі» проста здзекуюцца! Цяжка захоўваць прысутнасць духу, калі ў твае вароты залятае па 10—12 шайбаў. Я навучылася ставіцца да няўдач спакайней, бо у перажываннях няма сэнсу — яны толькі перашкаджаюць.

***— Якіх мэт хацелася б дасягнуць у будучым?***

— Галоўнае — павышаць свой узровень майстэрства. Яшчэ шмат чаму трэба навучыцца. Хацелася б прадстаўляць Беларусь на спартыўных спаборніцтвах. На жаль, у нашай краіне пакуль няма жаночай зборнай па хакеі. Але ж з-за гэтага не варта апускаць рукі, праўда?

**Ганна ЯЎСЕЙЧЫК, студэнтка III курса Інстытута журналістыкі БДУ.**




# СІЛА ДУМКІ

**Да нядаўняга часу была ўпэўнена, што на здаровы лад жыцця сёння «падсеў» ледзь не кожны другі. Сябры пасцяць у сацыяльных сетках фота запечанай курынай грудкі і фруктовых перакусаў, трыкатажныя фабрыкі выпускаюць спартыўныя касцюмы не толькі для школьнікаў, а трэнажорныя залы адкрываюцца па прынцыпе крамаў крокавай даступнасці. Але статыстыка, як аказалася, фіксуе зусім іншы вынік.**

Паводле звестак Белстата, толькі 9,4 працэнта гараджан і 3,8 працэнта вяскоўцаў вядуць здаровы лад жыцця. Яшчэ 90 працэнтаў беларусаў лічаць, што гэта важна, але самі не прытрымліваюцца яго. Нечакана, праўда?

Чаму так? У навукоўцаў якраз ёсць версія. Кажуць, карысную звычку набыць нашмат складаней, чым шкодную. Даследчыкі з аддзялення эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Універсітэцкага каледжа ў Лондане правялі эксперымент. 96 добраахвотнікаў на працягу 12 тыдняў прымушалі даводзіць да аўтаматызму такія рытуалы, як піць сок, есці фрукты і бегаць па 15 хвілін. Каб прывучыць сябе да рэгулярных прабежак, удзельнікам спатрэбілася ў сярэднім 66 (!) дзён (а шэсць чалавек увогуле кінулі гэту задуму). А вось шкодныя звычкі прычапляліся імгненна. Быццам бы справа ў хуткім задавальненні, якія прынсяць пірожныя і мяккая канапа. Як у анекдоце: «Зрабіў пяць падыходаў па 50 і адчуваю сябе цудоўна. Мой сакрэт у тым, што я замяніў прысяданні на канькі».

І сапраўды: як знайсці час на спорт, калі вакол столькі спакус? Фестывалі вулічнай ежы, рэстараны хуткага харчавання... У трэнажорцы, дзе я займалася, бегавыя дарожкі стаялі перад акном, адкуль адкрываўся цудоўны від на... бургерную. Стрымлівала толькі тое, што яна была зачынена на рамонт.

Хоць была спроба ўпісаць фастфуд у канцэпцыю здаровага ладу жыцця. Адзін інтэрнэт-партал паспрабаваў запусціць эксперымент: трое хлапцоў збіраліся прывесці сябе ў форму, і пры гэтым ім дазвалялася з'ядаць па бургеры ў дзень. У тэорыі ўсё павінна было атрымацца. Але на практыцы мужчыны справіліся на выдатна толькі з другой часткай задання — з'ядаць па бургеры (якраз, напэўна, спонсар пастаўляў іх бясплатна). А вось са спортам нешта не заладзілася. Ну і з вынікамі такога эксперымента, як вы здагадаліся, таксама. За месяц вага хлопцаў не зменшылася і на кілаграм.

